

**Праца па рэканструкцыі самага ўмяшчальнага сталічнага кінатэатра «Кастрычнік», які штогод прымае знакаміты кінафестываль «Лістапад», завяршаецца. Чаго чакаць ад прэм'еры?** СТАР 2



**Як кампенсаваць страты і захаваць структуру бытавога абслугоўвання, такую патрэбную вясковым жыхарам? Галоўнае — мець добрыя ідэі. Атрымаецца іх рэалізаваць — з'явяцца і грошы.** СТАР 3



**Чаму Вітольд Бялыніцкі-Біруля актуальны ў XXI стагоддзі? Скарыць яму ўдалося Расію, але з роднай зямлёй ён быў знітаваны: яе лёсам, яе мастацтвам турбаваўся...** СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛЮТАГА 2012 г. СЕРАДА № 40 (27155) Кошт 800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАЦВЕРДЗІЎ РАШЭННЕ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАГРАНІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў Рашэнне на правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнне пагранічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе, перадае БЕЛТА.**

Адкрываючы нараду па гэтым пытанні, у якой прынялі ўдзел кіраўнікі сілавых ведамстваў краіны, Прэзідэнт адзначыў, што мерапрыемствы невыпадкова праводзяцца ў такім складзе. «Гэта выклікана, па-першае, значнасцю забеспячэння пагранічнай бяспекі ў сучасных умовах. Па-другое, неабходнасцю эфектыўнай каардынацыі работы розных ведамстваў па выкананні гэтай задачы. І, па-трэцяе, патрабаваннямі па паляпшэнні якасці дзейнасці самога Дзяржаўнага пагранічнага камітэта», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі вывучыў асобныя напрамкі аператыўна-службовай дзейнасці і працэсы, што адбываюцца ў пагранічным ведамстве. «Вынікі работы мне дакладзены. Адкрыта скажу, не ўсё, што адбываецца ў органах пагранічнай службы, адпавядае ўзрослым патрабаванням сучаснасці. Характар існуючых недахопаў сведчыць аб тым, што недастаткова глыбока ацэньваецца аператыўная абстаноўка і, як вынік, не зусім правільна вызначаюцца асноўныя задачы будучай дзейнасці», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў кіраўніка беларускага пагранведамства Ігара Рачкоўскага далажыць аб тым, якія выклікі і пагрозы на граніцы найбольш небяспечныя для дзяржавы і што прадугледжваецца для іх нейтралізацыі і папярэджання. «У сваю чаргу прысутныя на нарадзе кіраўнікі сілавых структур павінны ацаніць, наколькі абгрунтавана вызначаны пагрозы ў гэтай сферы, а таксама канкрэтызаваць ступень свайго ўдзелу ў ахове дзяржграніцы», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён таксама дадаў, што хацеў бы пачуць ад дакладчыка аб тым, як плануецца палепшыць каардынацыю дзеянняў па забеспячэнні пагранічнай бяспекі, якія практычныя захады будуць прыняты па павышэнні эфектыўнасці аховы дзяржграніцы і якія ў гэтай дзейнасці ёсць праблемы і нявырашаныя пытанні.

«Прашу не забываць, што пагранічнае ведамства — гэта не проста сілавая структура. Гэта структура, якая знаходзіцца па перыметры таго кавалка зямлі, суверэнітэт якога мы абавязаны забяспечыць. Наколькі нашы ваенныя гатовы выканаць гэту задачу?» — паставіў пытанне Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што чакае ад усіх удзельнікаў нарады аб'ектыўных ацэнак сітуацыі і канкрэтных прапаноў па ўдасканаленні ўсяго комплексу мер у сферы пагранічнай бяспекі дзяржавы.

Як далажыў Ігар Рачкоўскі, у цэлым у 2011 годзе органы пагранічнай бяспекі Беларусі выканалі пастаўленыя задачы. У якасці адной з ключавых асаблівасцяў у дзейнасці па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі дзяржавы ў 2011 годзе ён назваў удзел органаў пагранічнай службы ў межах іх кампетэнцыі ў выкананні мэтавых задач па недапушчэнні дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне пад уздзеяннем знешніх і ўнутраных дэструктыўных сіл.

У 2011 годзе Дзяржпагранкамітэт прадоўжыў практычную рэалізацыю комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне пагранічнай бяспекі ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства.

Па выніках года зафіксаваны рост міграцыйнай актыўнасці грамадзян шэрагу краін — на 40,6 працэнта ўзрасла колькасць парушэнняў граніцы (з 564 да 793). На прыбалтыйскім напрамку затрымана 42,4 працэнта ад агульнай колькасці парушальнікаў граніцы. Акрамя таго, затрыманы 20 арганізатараў і саўдзельнікаў незаконнай транзітнай міграцыі, спынена дзейнасць сямі каналаў, выяўлена і распрацоўваецца амаль 20 магчымых каналаў незаконнай міграцыі. Атрымала далейшае развіццё работа добраахвотных дружын, з удзелам якіх затрыманы 876 парушальнікаў пагранічнага заканадаўства.

У рамках абароны эканамічных інтарэсаў дзяржавы на граніцы органамі пагранічнай службы сумесна з узаемадзеючымі затрымана таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму больш як Br79 млрд, што на 93 працэнты больш, чым у 2010 годзе. На ўкраінскім і літоўскім напрамках, найбольш актыўных адносна гэтага, затрымана адпаведна 32,8 працэнта і 26 працэнтаў таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў.

Органы пагранічнай службы таксама прадоўжылі эфектыўна змагацца з кантрабандай наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, незаконным абарачэннем зброі і боепрыпасаў, іншымі проціпраўнымі праявамі. Прынятыя меры па ўдасканаленні аховы «зялёнай» граніцы далі магчымасць на 13,8 працэнта скараціць агульную колькасць парушэнняў пагранічнага заканадаўства. Пры гэтым больш як у два разы павялічылася колькасць выдадзеных пропускаў у пагранічную зону замежным грамадзянам.

Захавалася агульная тэндэнцыя да росту ў 2011 годзе пасажырскага — на 2,3 працэнта, транспартнага — на 0,7 працэнта патокаў.

## ДРАПЕЖНЫЯ, РУЧНЫЯ, ПЯШЧОТНЫЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**З маленства мы звыкаемся з думкай, што воўк — самы небяспечны драпежнік. Што гэтага звера трэба засцерагацца і трымацца ад яго падалей. Маўляў, як ваўка ні кармі... Аднак жыхар вёскі Гайна Сяргей Селях паставіў пад сумнеў гэтую нікім не даказаную ісціну. Ён, дарэчы, не першы і не адзіны ў Беларусі, хто здолеў прыручыць шэрых драпежнікаў і знайсці з імі агульную мову. Больш за тое, двухгадовае назіранне за ручнымі жывёламі пераканала гаспадара, што ваўкі маюць патрэбу ў ласцы да сябе з боку людзей. Гэтак жа і самі шэрыя здольны праяўляць пяшчоту, якой надзелены толькі самыя адданыя і бязвінныя істоты. Выводзячы калматых гадаванцаў на прагулку, Сяргей дазваляе сабе пакачаць іх у снезе, пацягаць за поўсць. Дурэюць з ваўкамі і Сяргеевы дзеці Ульяна і Аляксей (на фотаздымку). Ваўкі не ўтойваюць радасці і туляцца да гаспадароў, імкнуцца лізнуць у твар. Аднак Селях перакананы — ва ўсім павінен быць разумны падыход.** СТАР 3

## ЦЫТАТА ДНЯ



Фота БЕЛТА.

**Намеснік міністра інфармацыі Уладзімір МАТУСЕВІЧ:**

***«З развіццём камунікатыўных тэхналогій (а яны ў Беларусі развіваюцца вельмі хутка) будзе існаваць падзел паміж газетамі і інтэрнэтам. Новая, аператыўная інфармацыя будзе ісці праз інтэрнэт, а газеты засяродзяцца на аўтарскіх матэрыялах і аналітыцы».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.02.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8070,00 | ▼ |
| Еўра | 10840,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279.00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1008,59 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст + 5
Віцебск – 2
Гомель – 1
Гродна + 4
Магілёў – 2
Мінск + 1

## БОЛЕВЫЯ КРОПКІ РЫНКУ ПРАЦЫ

**БЕЛАРУСКІ рынак працы, як і іншыя сферы жыцця, перажывае няпростыя часы. І хоць ён досыць стабільны і падкантрольны (а лічбам зарэгістраванага беспрацоўя можа пазайздросціць любая краіна), усё ж тут ёсць шэраг праблемных месцаў і негатыўных тэндэнцый. Дык што ж нас чакае ў бліжэйшай будучыні і якія задачы трэба будзе вырашаць?**

### МОЛАДЗЬ НЕ ХОЧА ІСЦІ Ў РАБОЧЫЯ

Для Беларусі характэрны высокі ўзровень занятасці — амаль 77%. Як заявіў на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК**, нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы, масавых вызваленняў і звальненняў не адбывалася. Разам з тым, у апошні час сітуацыя на рынку працы характарызуецца зніжэннем колькасці зваротаў у дзяржаўную службу занятасці і, адпаведна, зніжэннем рэгістрацыі беспрацоўных. У краіне свабодных працоўных месцаў цяпер практычна ўдвая больш, чым беспрацоўных, а ў Мінску — у 6 разоў больш.

На рынку працы, па словах Пятра Грушніка, сталі выяўляцца і некаторыя новыя тэндэнцыі. Так, летась знізілася колькасць работнікаў. Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у эканоміцы Беларусі ў студзені 2012 года былі заняты 4 млн 557 тыс. чалавек, што на 2,8% менш, чым у студзені 2011 года. Найбольш значнае зніжэнне колькасці работнікаў назіралася ў будаўнічай галіне — на 5,5 тыс. чалавек, на транспарце і ў сувязі — на 3,9 тыс., у прамысловасці — на 5,6 тыс. чалавек. Акрамя таго, у апошнія месяцы мінулага года назіраўся ўстойлівы рост недазанятасці ў шэрагу галін, у тым ліку ў будаўніцтве.

**Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі на канец студзеня 2012-га быў роўны 0,7%**

Адначасова зніжаецца прывабнасць працоўных месцаў для моладзі, а сярэдні ўзрост работнікаў расце. Як паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, сярэдні ўзрост работнікаў у 2007 годзе складаў 39,8 года, у 2010 годзе — ужо 40,4 года. Яшчэ горшы стан спраў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

### НЕАБХОДНА АПТЫМІЗАЦЫЯ КОЛЬКАСЦІ РАБОТНІКАЎ ЦЭЛЫХ ГАЛІН

Калі ў папярэднія гады асноўны ўпор рабіўся на захаванне любымі шляхамі працоўных месцаў і працоўных калектываў, то цяпер пастаўлена задача рэструктураваць арганізацыі, каб мінімізаваць сацыяльныя выдаткі з-за аптымізацыі колькасці работнікаў. Неабходна таксама забяспечыць арганізаваны ператок вызваленай рабочай сілы на новыя працоўныя месцы, у іншыя віды эканамічнай дзейнасці.

Працэсы аптымізацыі, па словах Пятра Грушніка, ужо ідуць. Так, ліквідаваны апараты ДА «Белбыт» і канцэрна «Белбіяфарм» у Мінску. Заканчваецца ліквідацыя РУВП «Гроднатэкстыль», дзе скарачэнню падлягалі больш за 300 работнікаў. Вядзецца падрыхтоўка да ліквідацыі нерэнтабельнай вытворчасці Магілёўскага завода штучнага валакна (паэтапна да 1 красавіка плануецца вызваліць 835 з 1452 работнікаў).

Важнейшай мерай па падтрымцы вызваляемых работнікаў з'яўляецца іх перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі. Таму ў рэспубліцы падрыхтаваны законапраект аб занятасці, які будзе разгледжаны ў другім чытанні ў красавіку. Ён гарантуе для наймальнікаў кампенсацыю выдаткаў на навучанне вызваляемых работнікаў, а таксама павелічэнне памеру стыпендыі (для тых, хто праходзіць перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі) да 8 базавых велічынь. Пры гэтым заканадаўствам прадугледжана апераджальнае навучанне работнікаў, якія знаходзяцца пад рызыкай звальнення, з фінансаваннем выдаткаў. Акрамя таго, Пётр Грушнік лічыць, што варта сур'ёзна заняцца аднаўленнем і развіццём сістэмы ўнутрывытворчага навучання, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі работнікаў непасрэдна на вытворчасці.

### СПЫНІЦЬ АДТОК КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОТНІКАЎ ЗА МЯЖУ

Сёння, калі межы краін АЭП адкрыты, грамадзяне Беларусі маюць магчымасць выязджаць на працу за мяжу, у першую чаргу ў Расійскую Федэрацыю. Як заявіла нядаўна на калегіі Мінпрацы і сацабароны **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**, з аднаго боку, гэта пашырэнне магчымасцяў для чалавека, а з другога — нашай краіне патрэбны гэтыя кадры. СТАР 2

**WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДОЛАР ПРАДАЎЖАЕ ПАДАЦЬ

**Па выніках таргоў на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы 28 лютага нацыянальная валюта чарговы раз умацавалася адносна долара і засталася ў межах бягучых ваганняў адносна еўра і расійскага рубля, паведамляе БЕЛТА.**

Да долара беларускі рубель учора зафіксаваў пазіцыю Br8 070/1$ (на папярэдніх таргах 27 лютага — Br8 110/ $1). Аб'ём праведзеных здзелак па гэтай валюце склаў $39,924 млн. На таргах расійскім рублём устанавіліся суадносіны Br279 за 1 расійскі рубель (27 лютага — Br278,5 за 1 расійскі рубель). Аб'ём таргоў склаўся на ўзроўні 968,348 млн расійскіх рублёў. Адносна еўра беларускі рубель спыніўся на пазіцыі Br10 840 за 1 еўра (27 лютага — Br10 900 за 1 еўра). Падагульняючы аб'ём здзелак склаў 27,9 млн еўра.

Такім чынам, курс нацыянальнай валюты зрабіў чарговы крок да псіхалагічна важнай адзнакі Br8 000/$1.

### ФАЛЬШЫВАК ЛЕТАСЬ БЫЛО МЕНШ

**На тэрыторыі Беларусі канфіскуецца ў асноўным падробленая замежная валюта. Толькі 7 працэнтаў зарэгістраваных выпадкаў прыпадаюць на долю нацыянальнай валюты.**

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, выпадкаў поўнага вырабу фальшывай замежнай валюты ў Беларусі не ўстаноўлена. Уся яна вырабляецца на высакаякасным паліграфічным абсталяванні і завозіцца ў нашу краіну з іншых дзяржаў, часта грамадзянамі, якія і не падазраюць аб падробцы. Летась факты фальшываманецтва склалі ў структуры эканамічнай злачыннасці каля 18%. Гэта менш, чым у годзе 2010-м, паколькі ў 2011-м меў месца валютны крызіс, падчас якога насельніцтва масава не здавала валюту ў банкі, дзе ў асноўным і выяўляюцца фальшывыя грошы. Усяго летась зарэгістравана 1121 злачынства, звязанае з фальшываманецтвам. Канфіскаваныя грашовыя сродкі адпавядаюць суме, эквівалентнай 9 млрд рублёў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДОЎГ УКРАІНСКІХ СПАЖЫЎЦОЎ ЗА ГАЗ — БОЛЬШ ЗА $3 МЛРД

Паводле інфармацыі Нацыянальнай акцыянернай кампаніі «Нафтагаз Украіны», агульная запазычанасць усіх катэгорый спажыўцоў за прыродны газ за першую дэкаду лютага вырасла больш чым на 13% у параўнанні з папярэднім перыядам і склала 25,3 млрд грыўняў. Найбольшыя запазычанасці ў спажыўцоў Данецкай, Днепрапятроўскай, Луганскай і Харкаўскай абласцей, а таксама ў горадзе Кіеве. Пры гэтым большая частка даўгоў за спажыты прыродны газ прыходзіцца на прадпрыемствы камунальнай цеплаэнергетыкі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

### СААЗ РЭКАМЕНДУЕ ГУЛЬЦАМ І ЗАЎЗЯТАРАМ ЧЕ-2012 ПА ФУТБОЛЕ ЗРАБІЦЬ ПРЫШЧЭПКІ

Сусветная арганізацыя аховы здароўя выпусціла шэраг рэкамендацый для тых, хто сабраўся на 14-ы чэмпіянат Еўропы па футболе, які пройдзе ва Украіне і Польшчы з 8 чэрвеня па 1 ліпеня. У прыватнасці, медыкі параілі гульцам, заўзятарам і проста аматарам футбола перад паездкай пераканацца ў наяўнасці дзеючых прышчэпак, у першую чаргу — супраць адру і краснухі. Акрамя таго, СААЗ рэкамендуе даведацца, ці будзе ваша медыцынская страхоўка пакрываць, у выпадку неабходнасці, выдаткі ва ўкраінскіх і польскіх бальніцах і паліклініках.




### ЯПОНІЮ ВЫКРЫЛІ ВА ЎТОЙВАННІ МАШТАБАЎ АВАРЫІ НА «ФУКУСІМЕ»

Японскі ўрад утойваў ад насельніцтва сапраўдныя маштабы аварыі на АЭС «Фукусіма-1». Да такой высновы прыйшлі эксперты незалежнай арганізацыі Rebuild Japan Initiative Foundation. У падрыхтаванай арганізацыяй 400-старонкавай справаздачы таксама адзначаецца, што японскія ўлады ўтойвалі маштабы таго, што адбылося, ад сваіх замежных партнёраў, у тым ліку ЗША.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СЕРБІЯ ПАГАДЗІЛАСЯ НА «ПРЫНІЖЭННЕ» ДЗЕЛЯ СТАТУСУ Ў ЕС?




Сербія павысіла свае шанцы стаць кандыдатам на ўступленне ў Еўрасаюз, пайшоўшы на ўступкі ў адносінах да самаабвешчанай рэспублікі Косава. На мінулым тыдні Бялград і Прышціна заключылі два пагадненні — аб рэгіянальным супрацоўніцтве і аб сумесным кіраванні пунктамі пропуску на мяжы, якія, па сутнасці, азначаюць прызнанне сербамі незалежнасці краю.

У прыватнасці, улады Сербіі пагадзіліся з тым, каб Косава прымала ўдзел у рэгіянальных міждзяржаўных форумах. Да гэтага часткова прызнаную рэспубліку прадстаўляла місія ААН у Косаве. Цяпер Бялград пагадзіўся на выкарыстанне назвы «Косава» для абазначэння дэлегацыі Прышціны — праўда, з агаворкамі. Так, на таблічцы з назвай «Косава» будзе стаяць зорачка. Яна будзе адсылаць да зноскі, якая тлумачыць супярэчлівы статус тэрыторыі, піша «Коммерсант».

Хоць у Бялградзе настойваюць, што гаворкі аб прызнанні косаўскай незалежнасці не ідзе, такое рашэнне з'яўляецца крокам у гэтым кірунку. Па крайняй меры, менавіта так яго разглядаюць у самім Косаве і ў ЗША. У Прышціне дакумент расцанілі як вялікі поспех. Дамоўленасць была дасягнута напярэдадні разгляду сербскай заяўкі на атрыманне статусу кандыдата ў ЕС.

## КОРАТКА

У Беларусі пачаўся прызыў на тэрміновую ваенную службу. Калі раней мерапрыемствы прызыву ажыццяўляліся ў красавіку—ліпені і кастрычніку—студзені, то з 2011 года яны перанесены на люты—май і жнівень—лістапад. Такім чынам, чарговы прызыў грамадзян на тэрміновую ваенную службу будзе ажыццяўляцца ў лютым—маі гэтага года.

З-за пажару ў кацельні дзіцячы сад у вёсцы Дусаеўшчына Капыльскага раёна з канца лютага пераводзіцца ў дзіцячы сад №1 райцэнтра. Для дастаўкі дзетак арганізаваны аўтобусы маршрут. Штодня садок наведвалі 17 дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў.

На падкормачнай пляцоўцы ў паляўнічых угоддзях Смалявіцкай раённай структуры таварыства паляўнічых і рыбаловаў у пятлі быў знойдзены дзік. Гэта аказалася самка з 8 эмбрыёнамі. Ненароджанае дзіцяня па нанесенай шкодзе прыраўноўваецца да здабычы дарослай асобіны. Такім чынам, прыродзе браканьеры нанеслі шкоду амаль на 19 мільёнаў рублёў.

## ШТО АЗНАЧАЕ ДЛЯ ВАС «ЛІШНІ» ДЗЕНЬ ВЫСАКОСНАГА ГОДА?



**Васіль БУЛЬБЯНКОЎ, намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі, палкоўнік міліцыі:**

— У Бога ўсе дні роўныя. Гэта далёка не першы і не другі высакосны год у маім жыцці: я ж ужо звыш 30 гадоў прапрацаваў у Дзяржаўтаінспекцыі. Лічу, што ў любы дзень трэба заставацца верным самому сабе, сваёй справе, уважліва ставіцца да родных, калег, дапамагаць у меру сваіх сіл незнаёмым людзям, быць законапаслухмяным. Бо калі людзі не будуць парушаць закон, у тым ліку і на дарозе, то менш будзе няшчасных выпадкаў, зламаных лёсаў.



**Валянціна ЖУРАЎСКАЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Калі шчыра, то ніколі ў жыцці не задумвалася над гэтым пытаннем. Я не забабонная. Не веру ні ў каляндар майя, ні ў канец свету. Жыву і планую сваё жыццё па звычайным календары. З другога боку, цудоўна, што сёлета ў нас будзе на адзін дзень больш. Лішні дзень не перашкодзіць! Што я буду рабіць 29 лютага? Мабыць, прачытаю лішнюю кнігу альбо скарыстаю «лішні» дзень для таго, каб падумаць, якое набыць насенне, каб акультурыць участак ля дома. Вясна ж ужо на носе. Трэба цаніць кожны дзень! Бо адзін дзень жыцця — гэта таксама жыццё.



**Мікалай ВАХОНІН, дырэктар РУП «Інстытут меліярацыі» НПЦ па земляробстве НАН Беларусі, кандыдат тэхнічных навук:**

— Лішні дзень жыцця. Калі б не сказалі, дык і не ўзгадаў бы, пэўна, не надаў гэтаму значэння. Лішні дзень — гэта лішняя магчымасць. Таму сёлета ў нас на цэлы дзень больш магчымасцяў. Трэба яго выкарыстаць для добрай справы. У маім выпадку гэта яшчэ адна магчымасць, каб зрабіць унёсак у навуку, каб укараніць у жыццё новыя распрацоўкі. У асабістым жыцці — магчымасць правесці лішні вечар з сям'ёй. ...А вось каб вырвацца ў хакей у гэты вечар пагуляць, так рэдка атрымліваецца апошнім часам. Мароз жа якраз абяцаюць.

**Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.**

■ Афіцыйна

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА МАЕ НАМЕР ПРАПАНАВАЦЬ КІРАЎНІЦТВУ РАСІІ СТВАРЭННЕ БУЙНОЙ СУМЕСНАЙ КАМПАНІІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка мае намер у бліжэйшы час прапанаваць кіраўніцтву Расійскай Федэрацыі стварэнне буйной сумеснай кампаніі па вытворчасці ўгнаенняў. Аб гэтым ён заявіў учора, узгадняючы назначэнне генеральным дырэктарам ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» Валерыя Іванова.**

«Мы абмяркуем варыянт работы Беларусі і Расіі з угнаеннямі ўвогуле. У нас ёсць калійная кампанія, якая, дарэчы, сёння займаецца і продажам азотных угнаенняў, — гэта вопыт. Мы прапануем расіянам стварыць магутнейшае аб'яднанне, якое будзе ўплываць і на цэны на сусветным рынку, мы гэта не скрываем, і забяспечваць больш якасным таварам нашых замежных партнёраў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Фарміруючы гэту кампанію (БКК. — **Заўвага БЕЛТА**) з расіянамі, мы дамаўляліся, што ўсе продажы будуць ісці праз Беларускую калійную кампанію — расійскіх угнаенняў і нашых. Гэта трэба захаваць. Якія там варыянты, каб лепш і танней мець крэдыты для таго, каб на рынку больш эфектыўна працаваць, гэта ваша справа, на гэта трэба ісці. Але прынцып застаецца адзін: той, пра які мы дамаўляліся», — сказаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да Валерыя Іванова, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Вы ведаеце сістэму вытворчасці, цяпер вам трэба будзе дасканала вывучыць сістэму продажаў, каб найбольш выгадна выбудаваць сёння работу і ў інтарэсах нашай краіны, і расіян, гэта нашы партнёры. Тут усё павінна быць справядліва і раўнапраўна. Нам выгады не патрэбны за кошт Расіі, але і за кошт нас ніхто не павінен атрымліваць нейкія выгады. Мы павінны дзейнічаць у адзіным ключы. І шукаць, дзе лепш для нас усіх. А значыць, для Беларускай калійнай кампаніі».

Беларуская калійная кампанія — эксклюзіўны пастаўшчык калійных угнаенняў вытворчасці ААТ «Беларуськалій» (г. Салігорск, Беларусь) і ААТ «Уралкалій» (Пермскі край, Расія) на замежныя рынкі і вядучы сусветны экспарцёр гэтай прадукцыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

# БОЛЕВЫЯ КРОПКІ РЫНКУ ПРАЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб знізіць адток работнікаў з краіны, неабходна забяспечыць аднолькавы ўзровень аплаты працы ў параўнанні з нашымі суседзямі. Зараз у Беларусі праводзіцца сур'ёзная работа па кардынальным удасканаленні заканадаўства ў галіне аплаты працы. З-пад прамога дзяржаўнага рэгулявання выведзена больш за 87 тыс. арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці. Аднак далёка не ўсе кіраўнікі сталі ўкараняць гнуткую сістэму аплаты працы. «Гэта сведчыць аб тым, што кіраўнікам зручней працаваць як раней, — сказала міністр. — Як у такім выпадку ўтрымліваць кваліфікаваныя кадры, калі ім не плаціць?!»

**P.S.** *Больш падрабязна аб заработнай плаце мы раскажам у адным з бліжэйшых нумароў газеты.*

**Святлана БУСЬКО.**

**Урад прыняў дзяржаўную праграму садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2012 год з аб'ёмам фінансавання 225,9 млрд руб. Яе асноўная мэта — павышэнне эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў, канкурэнтаздольнасці рабочай сілы.**

### А ТЫМ ЧАСАМ ...

**У свеце ўтварыўся «запас» беспрацоўных у памеры 200 млн чалавек**

Як адзначаецца ў штогадовым дакладзе аб глабальнай занятасці, падрыхтаваным Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП), свет сутыкнуўся з неабходнасцю стварыць у бліжэйшае дзесяцігоддзе 600 млн новых працоўных месцаў, каб забяспечыць устойлівы рост і захаваць сацыяльнае адзінства.

«Пасля трох гадоў бесперапыннага крызісу на глабальных рынках працы і на фоне перспектывы далейшага спаду эканамічнай актыўнасці ва ўсім свеце ўтварыўся «запас» беспрацоўных у памеры 200 млн чалавек», — сцвярджае МАП у сваім штогадовым дакладзе «Глабальныя тэндэнцыі занятасці 2012 года: прадухіліць развіццё крызісу занятасці». Акрамя таго, у дакладзе ўказваецца, што на працягу бліжэйшага дзесяцігоддзя неабходна будзе стварыць яшчэ больш за 400 млн новых працоўных месцаў, каб «паглынуць» прырост рабочай сілы прыкладна на 40 млн работнікаў у год.

Да таго ж неабходна стварэнне не проста працоўных месцаў, а годных працоўных месцаў (у асноўным у краінах, якія развіваюцца) для 900 млн работнікаў, што жывуць разам са сваімі сем'ямі менш чым на 2 долары ЗША ў дзень.

«Нягледзячы на энергічныя намаганні ўрадаў, крызіс занятасці не слабее, і кожны трэці работнік у свеце (гэта прыкладна 1 млрд 100 млн чалавек) альбо не мае працы, альбо жыве ў беднасці, — заяўляе Генеральны дырэктар МАП Хуан Самавія. Сярод тых, хто больш за ўсё пакутуе ад крызісу занятасці, паранейшаму застаецца моладзь.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Міхасю Канстанцінавічу Міцкевічу, сыну народнага паэта Беларусі, доктару тэхнічных навук, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, старшаму навуковаму супрацоўніку Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю **жонкі Наталлі Іванаўны.**

Уважаемые акционеры

**ОАО «БЕЛКОТЛООЧИСТКА»!**

**Очередное собрание акционеров состоится 29 марта 2012 года, начало собрания 10.00, место проведения – г. Минск, ул. Минина, 26. Регистрация проводится с 8.30 до 9.30 (при себе иметь паспорт)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 г. и основных направлениях деятельности в 2012 г.
2. Утверждение бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2011 г., определение порядка выплаты дивидендов.
3. Отчет наблюдательного совета и итоги аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 г.
4. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
5. О приобретении Обществом части акций собственного выпуска.

**Тел. для справок (017) 227 39 50.**

УНП 100071353

■ Ва ўрадзе

# ПАВЫСІЦЦА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ІНВЕСТЫЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Аб гэтым заявіў учора на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка, перадае БЕЛТА.**

Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў мінулым годзе тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал склаў 113,3 працэнта пры заданні 116-117 працэнтаў. З 202 запланаваных да ўводу інвестпраектаў 75 не завершаны. З іх 16 праектаў не выканана Мінсельгасхарчам, 8 — Мінэнерга, 5 — канцэрнам «Беллеспаперапрам». «Дрэнна справы ідуць і з пункту гледжання прамых замежных інвестыцый: у мінулым годзе пры заданні $6,5 млрд прыцягнута толькі $3,118 млрд, — канстатаваў Уладзімір Сямашка. — Але гэта дзякуючы ў многім продажу 50 працэнтаў акцый «Белтрансгаза».

Аналізуючы вынікі інвестыцыйнай дзейнасці ў Беларусі за студзень гэтага года, першы намеснік кіраўніка ўрада адзначыў, што запланаваныя паказчыкі па гэтым напрамку таксама не выконваюцца. «Трэба разабрацца, у чым прычыны неэфектыўнай работы», — запатрабаваў ён. Уладзімір Сямашка прапанаваў дэталёва прааналізаваць перспектывы далейшага ўдасканалення заканадаўчай базы, паляпшэння інвестыцыйнага клімату для больш эфектыўнага прыцягнення інвестараў да выканання інвестпраектаў. На думку першага віцэ-прэм'ера, за апошнія гады ў краіне зроблена даволі шмат для развіцця інвестыцыйнай дзейнасці. Ён нагадаў аб тым, што нядаўна ў Беларусі выйшаў указ № 101, які стварае больш камфортныя ўмовы для развіцця дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў, падрыхтаваны праект дэкрэта, які павінен стымуляваць прадпрымальніцкую дзейнасць у малых і сярэдніх населеных пунктах.

Вялікай перавагай з пункту гледжання прыцягнення інвестараў павінна стаць для Беларусі ўваходжанне ў Мытны саюз, АЭП. «Замежныя інвестары павінны разумець, што, прыходзячы ў Беларусь, яны прыходзяць у Мытны саюз з насельніцтвам 170 млн. Гэта саюз, які развіваецца з тэмпам прыросту 5-6 працэнтаў кожны год», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу міністр эканомікі Мікалай Снапкоў паведаміў, што ў 2011 годзе ў Беларусі ажыццяўлялася рэалізацыя 422 асноўных інвестпраектаў, з гэтай мэтай асвоена амаль Br22 трлн. Сярод асноўных прычын, якія прывялі да зрыву тэрмінаў рэалізацыі інвестпраектаў, — адсутнасць разлікаў эфектыўнасці праектаў, праектна-каштарыснай дакументацыі, несвоечасовае правядзенне тэндараў на закупку і пастаўку абсталявання, недастатковая прапрацоўка фінансавых крыніц. Усё гэта прывяло да страты для эканомікі рэальнай прадукцыі з дабаўленай вартасцю, і як вынік — зьмяншэнне падатковых паступленняў у бюджэт, адсутнасць росту зарплат, а таксама падаражэнне гэтых праектаў. У якасці прыкладу Мікалай Снапкоў прывёў цэментную галіну. Зрыў тэрмінаў уводу тэхналагічных ліній на трох цэментных заводах і перанос іх на 2012 год прывялі да страты тавarнай прадукцыі за 2011—2012 гады ў аб'ёме $301 млн і дабаўленай вартасці на суму $238 млн.

Міністр канстатаваў, што цяпер значная колькасць аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія належаць дзяржаве, асноўная частка якіх прыпадае на камунальную ўласнасць, з'яўляюцца невыкарыстоўваемымі або незавершанымі. «Мы лічым, што ў 2012 годзе асноўны акцэнт павінен быць зроблены ў большай ступені на інвесціраванне ў абсталяванне пры наяўнасці будынкаў і збудаванняў, у якіх дастаткова правесці нязначныя рамонтныя работы для фарміравання базы, неабходнай для ўстаноўкі абсталявання», — сказаў ён. Рэалізацыя праектаў на базе практычна гатовых аб'ектаў дасць магчымасць скараціць да мінімуму інвестыцыйную стадыю праектаў.

Акрамя таго, павышэнню эфектыўнасці інвестыцыйнай дзейнасці будзе садзейнічаць барацьба з бюракратычнай валакітай, якая часта стрымлівае выкананне інвестпраектаў. «Пры праходжанні ўсіх этапаў інвестару можа спатрэбіцца ад паўтара да трох гадоў», — расказаў ён. У сувязі з гэтым Мікалай Снапкоў прапанаваў Дзяржстандарту максімальна спрасціць механізм правядзення дзяржэкспертызы будаўнічых праектаў, абласным і Мінскаму гарвыканкаму выключыць зацягванне тэрмінаў пры правядзенні аўкцыёнаў, атрыманні інвестарамі дазвольных дакументаў, рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Неабходна таксама ўвядзенне рэальна працуючай сістэмы аднаго акна ў частцы падключэння інвестараў да інжынерных сетак, дадаў Мікалай Снапкоў.

■ Добрая навіна

# КОЖНЫ ГЛЯДАЧ АТРЫМАЕ ПА «МЯККІМ МЕСЦЫ»

## «Кастрычнік» рыхтуецца да 8 Сакавіка

**Праца па рэканструкцыі самага ўмяшчальнага сталічнага кінатэатра «Кастрычнік», які штогод прымае знакаміты кінафестываль «Лістапад», завяршаецца. Да абяцанага часу адкрыцця (да свята 8 Сакавіка) засталося крыху больш за тыдзень. Таму рамонтнай працы хапае не толькі будаўнікам, але і дырэктару кінатэатра Аляксандру Власенка, які за ўсім сочыць асабіста. На чым будуць сядзець гледачы, ці паспеюць будаўнікі скончыць працу да вызначанага тэрміну і на чыю скуру падобная новая плітка на ўваходзе ў кінатэатр, і вырашана было пацікавіцца...**

...З самага ўвахода нос чуе пах свежай фарбы, а вушы — грукат, які ствараюць будаўнічыя работы. Па калідорах ходзяць засяроджаныя рабочыя, носячы хто вёдры, хто нейкія скруткі дроту ды розныя спецыяльныя рэчы, прызначэнне якіх на першы погляд я так і не вызначыла. На ўваходзе замест шэра-белага мармуру на падлозе паклалі карычневую няслізкую плітку, якая па абрысах чымсьці нагадвае змяіную скуру.

Падымаемся з фатографам наверх, дзе перад самым уваходам у залу, акурат дзе месцяцца зараснікі кветак, заўважаем горы цэлафанавай плёнкі, з якой паспелі ўжо «вызваліць» пэўную колькасць з новых 1200 крэслаў, якія будуць у кіназале. Гэта, вядома, менш за ранейшыя 1340, але «Кастрычнік» па-ранейшаму застанецца самым «умяшчальным» ва ўсёй сталіцы.

Дырэктар кінатэатра Аляксандр Власенка распавядае аб рабоце па рэканструкцыі:

— Вось, як бачыце, мы ўжо абнавілі паркет, пачысцілі яго і пафарбавалі, усталявалі амаль усе крэслы, змянілі лямпы, а зараз якраз займаемся афарбоўкай сцен.

Іх, дарэчы, фарбуюць з дапамогай пульверызатараў гэтак жа, як і высокія помнікі ці будынкі: рабочыя залазяць на самы верх і трымаюцца на спецыяльнай страхоўцы, як альпіністы.

Новыя глядацкія крэслы — абабітыя зялёным аксамітам, вельмі мяккія і зручныя, шырокія і з высокімі спінкамі. Крэслы, дарэчы, айчыннай вытворчасці. Адна такая «сядушка», па словах Аляксандра Фёдаравіча, каштуе каля мільёна айчынных рублёў. Ды і ўвогуле, грошы, якія пойдуць на рамонт, немалыя, што, відавочна, адаб'ецца на кошце квітка. Якой будзе гэтая сума, пакуль казаць рана, але, як расказаў дырэктар «Кастрычніка», каб вярнуць затрачаныя на абнаўленне грошы, кінатэатру спатрэбяцца прыкладна два гады працы.

Акрамя зручных месцаў для гледачоў, у план рэканструкцыі ўваходзіла набыццё двух камплектаў новага лічбавага абсталявання для паказу фільмаў, а таксама ўстаноўка вялікага экрана шырынёй у 22 метры. Месца яго будучай «дыслакацыі» пакуль зашторана занавесам, а сцэну «акупіравалі» будаўнікі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Адна «сядушка» ў абноўленай зале «Кастрычніка» каштуе каля мільёна рублёў.

Аляксандр Власенка расказаў, што планы па набыцці экрана і лічбавага абсталявання адкладзены на май-чэрвень:

— У сакавіку кінатэатр адкрыецца пасля ўсталявання крэслаў і абнаўлення залы, а новы экран трэба чакаць на пачатку лета.

Спецыяльна для тых, хто хваляваўся, што не трапіць у дзень жаночага свята на жаданы фільм менавіта ў кінатэатр «Кастрычнік», запыталася, ці змогуць будаўнікі скончыць працу да названага тэрміну і ці не страцяць надзеі будучыя гледачы:

— Пакуль што ўсё паспяваем як патрэбна.

Верагодна, тым, хто стане першымі наведнікамі кінатэатра пасля рэканструкцыі, цікава будзе паглядзець не толькі новы фільм, але і ўбачыць, як выглядае абноўленая зала «Кастрычніка». У жаночы дзень там будуць дэманстраваць галівудскі блокбастар з мужчынскім імем «Джон Картэр», а таксама расійскія камедыі «Мамы» і «Восем першых спатканняў».

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Крымінал

# БАНКІРА ДОЛАР СПАКУСІЎ

**Начальнік Цэнтра банкаўскіх паслуг аднаго з камерцыйных банкаў Бабруйска затрыманы пры абмене 5800 долараў ЗША на беларускія рублі.**

«Ёсць падставы лічыць, што гэтай дзейнасцю цяпер ужо былы кіраўнік банкаўскага філіяла займаўся сістэматычна, — паведамляецца ў інфармацыі **ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці.** — Аб'явы пра абмен валюты размяшчаліся ім на інтэрнэт-сайце. Сустрэчы і абмен валюты адбываліся ў спецыяльна абумоўленым месцы і па загадзя вызначаным курсе». Правапарушальнік прыцягнуты да адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 1,75 млн рублёў з канфіскацыяй грашовых сродкаў у суме 50,2 млн рублёў. Таксама ва ўнівермагу «Цэнтральны» горада Магілёва супрацоўнікі УДФР затрымалі пры спробе абмену 120 тысяч расійскіх рублёў на 3845 долараў ЗША 48-гадовую магіляўчанку. Жанчына нідзе не працуе, але раней неаднаразова прыцягвалася да адказнасці за незаконныя валютныя аперацыі.

Толькі за два сёлетнія месяцы ўпраўленнем выключаны з ценявога абароту 4550 долараў ЗША, 45 тысяч расійскіх рублёў, 47 млн беларускіх рублёў. 9 асоб прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, распачаты 2 крымінальныя справы па фактах незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з абменам валюты. УДФР яшчэ раз папярэджвае, што пад адказнасць за незаконныя валютныя аперацыі падпадаюць не толькі самі валютчыкі, але і грамадзяне, якія скарысталіся іх паслугамі. Штраф — да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй абменных грошай.

**Ілона ІВАНОВА**

**Информация о застройщике**

**Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» (ООО «Витасанплюс»).**

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, помещение 9.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 4 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038, в результате реорганизации путем преобразования Частного строительного унитарного предприятия «Витасанплюс», зарегистрированного решением Минского городского исполнительного комитета от 27 июля 2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В течение трех лет, предшествующих заключению договора, ООО «Витасанплюс» принимало участие в проекте строительства жилого дома по переулку Томскому, д. 35 в г. Минске.

**Информация о проекте**

**Цель проекта:** строительство многоквартирного жилого дома № 2 в п. Сеница комплекса многоэтажных жилых домов неповышенной комфортности и подъездной автодороги в а.г. Сеница Сеницкого сельсовета Минского района.

**Срок реализации проекта:** 1 квартал 2012 г. – 4 квартал 2012 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 1111Ж–1283/11, выданное 09.11.2011 г. Дочерним Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза по Минской области».

**Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома:** Минская область, Минский район, аг. Сеница, район улиц Набережной, местного проезда, ул. Я. Купалы, ул. Коммунальной.

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**строительства жилого дома № 2 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов неповышенной комфортности в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минского области**

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:** 9-этажный 107-квартирный 3-секционный жилой дом с техподпольем и теплым чердаком, входящий во 2-ую очередь строительства комплекса многоэтажных жилых домов неповышенной комфортности по серии М 464-9-У1-01. Жилой дом оборудован всеми необходимыми инженерными системами. Лифтовые установки приняты грузоподъемностью 400 кг. На 1-ом этаже размещены встроенные помещения товарищества собственников с отдельным входом. Источником теплоснабжения является существующая котельная пос. Юбилейный. В качестве нагревательных приборов к установке приняты алюминиевые радиаторы. В жилом доме запроектированы поквартирные системы отопления с устройством поквартирных узлов учета тепла. Для поквартирного учета холодной и горячей воды предусмотрена установка счетчиков СВХ-15 и СВГ-15. В каждой квартире предусмотрено устройство внутриквартирного пожаротушения. В здании выполняется автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ). Устройство абонентской проводки выполнено с использованием абонентского волоконно-оптического кабеля и абонентских оптических розеток, устанавливаемых в квартирах. Телевидение согласно технических условий выполнено с применением интерактивного телевидения «ZALA». Охранно-переговорное устройство (ОПУ) «ПИРРС-1000 Люкс» обеспечивает цифровой набор необходимого абонента с вызывного устройства (ВУ), организацию двухсторонней связи между абонентом и посетителем, дистанционное управление замком входной двери электронным ключом специальной формы. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено от проектируемого проезда с ул. Набережной. Количество квартир в доме – 107, в том числе: однокомнатных – 26 ед., двухкомнатных – 31 ед., трехкомнатных – 50 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется.

**Цены на объекты долевого строительства:**

однокомнатные квартиры – 6 950 000 рублей за 1 кв.м общей площади;

двухкомнатные квартиры – 6 790 000 рублей за 1 кв.м общей площади;

трехкомнатные квартиры – 6 490 000 рублей за 1 кв.м общей площади.

**Условия оплаты:** уплата цены договора производится дольщиком единовременно не позднее 7 (семи) календарных дней с момента подписания договора создания объекта долевого строительства. По соглашению сторон, уплата цены договора может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства**: 20 единиц.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского районного исполнительного комитета (Минский райисполком) от 22 февраля 2012 г. № 1057 «О предоставлении земельного участка обществу с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» для строительства многоквартирного жилого дома № 2 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов неповышенной комфортности в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минской области».

Свидетельство (удостоверение) № 600/1260 – 2528 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 623686605101001049, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, площадь – 0,5095 га, назначение – Земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома № 2 (по генплану), составлено Республиканским унитарным предприятием «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 28 февраля 2012 г.

**Границы земельного участка:** с севера – строящийся 9-этажный жилой дом, с запада – ул. Набережная с площадью, с востока – свободная от застройки территория, 9-этажный жилой дом № 3 по генплану, с юга – спортивное гнездо.

**Площадь земельного участка:** 0,5095 га.

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрено полное благоустройство территории с организацией подъезда, парковками общей вместительностью на 31 машино-место, тротуаром для пешеходов шириной 1,5 м, дорожки и площадки к жилому дому из бетонной плитки. На территории строительства жилого дома запроектирована площадка для чистки вещей, площадка для отдыха и детская игровая площадка. Территория оборудуется малыми формами архитектуры. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено от проектируемого проезда с ул. Набережной. Проектом предусмотрено устройство подпорной стенки между жилыми домами № 2 и № 3 по генплану.

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме:** на первом этаже запроектированы помещение товарищества собственников и электрощитовая. Техподполье дома предназначено для размещения инженерных сетей.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

**Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию:** 4 квартал 2012 года.

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда № 050911–01 от 05.09.2011 г. заключен Застройщиком с Обществом с ограниченной ответственностью «Строительная компания «ЕвроСтрой».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел.: 8 017 2 900 901, 8 029 1 907 901) или на сайте **vivainvest.by.**

## ШЛЯХ ДА БУДУЧЫНІ: СЛАВЯНСКІ ЗРЭЗ

**На 12-й навукова-практычнай канферэнцыі «Славянскі свет на шляху да будучыні!», што завяршыла сваю работу ў Мінску, агучана прапанова прадаставіць славянскім краінам статус назіральнікаў у Еўразійскім саюзе.**

Зразумела, тым дзяржавам, якія не лічацца членамі гэтага палітычнага аб'яднання. Выпучаючы гэту ідэю, першы намеснік старшыні Усеславянскага сабора, старшыня Усеславянскага камітэта і Чэшска-Мараўскага славянскага камітэта А. Зданек прапанаваў удзельнікам канферэнцыі адпаведны дакумент, распрацаваны дэлегацыяй з Чэшскай Рэспублікі. Вырашана накіраваць яго кіраўніцтву Еўразійскага саюза. Істотнай адметнасцю канферэнцыі стала не толькі тое, што апроч удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, прысутнічалі і прадстаўнікі з Чэхіі і Балгарыі, але і тое, што дыскусіі, ініцыяваныя на пачатку і старшынёю Славянскага камітэта Сяргеем Касцянам, і шэрагам іншых выступоўцаў, мелі шматгранны кантэкст, шырокія тэматычныя абсягі. Многія з гасцей прадстаўнічага форума падкрэслівалі прыярытэты беларускай эканамічнай і сацыяльна-палітычнай мадэлі, гаварылі пра лідарства нашай краіны ў славянскім свеце, у адстойванні і захаванні духоўных каранёў славянства.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**.

## РЫХТАВАЛІ ПАЛОНКУ І... ВЫРАТАВАЛІ ЧАЛАВЕКА

**У Гродне адбылося гарадское свята «Зіма-2012», а напярэдадні днём спецыялісты МНС, рыхтуючы для яго ўдзельнікаў — «маржоў» — палонку, паказалі сябе сапраўднымі прафесіяналамі.**

Яны аказаліся, як кажуць у такіх выпадках, у патрэбным месцы ў патрэбны час: начальнік вадалазна-выратавальнай службы Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Аляксандр Кудраўцаў убачыў па процілеглым беразе Нёмана жанчыну, якая танула, спрабуючы ўхапіцца за лёд. Аляксандр і майстар-выратавальнік Андрэй Будзённы апранулі вадалазныя касцюмы і кінуліся ў ваду. Кудраўцаў — на выратавальнай дошцы, яго калега — уплаў з выратавальнымі вяроўкамі. Нягледзячы на моцнае цячэнне і плывучыя глыбы, пацярпелую (як потым высветлілася, 33-гадовую жыхарку з Гродна), якая знаходзілася ў непрытомным стане, пагрузілі на выратавальную дошку і пры дапамозе вяровак транспартавалі да берага. Потым жанчыну шпіталізавалі, і, паводле апошняй інфармацыі, цяпер яе жыццю нічога не пагражае.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПАЛЕЗ НА КАЗЫРОК ПАД'ЕЗДА

**А самастойна спусціцца з яго хлопчык 2003 года нараджэння ўжо не змог.**

Гісторыя здарылася ў сталіцы: двое хлапчукоў каля паўдня гулялі каля пад'езда шматпавярховага дома, калі адзін з іх, свавольнічаючы, узяў і закінуў заплечнік сябра на казырок. Гаспадар вырашыў самастойна дастаць сваю рэч і палез наверх. Залезці — залез, а вось здымаць вучня 2 класа сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 31 пры дапамозе лесвіцы давялося ўжо выратавальнікам. Медыцынская дапамога юнаму «верхалазу», на шчасце, не спатрэбілася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ІНТЭРНЭТ ПАДАРАЖЭЕ

РУП «Белтэлекам» аб'явіў аб павышэнні з 1 сакавіка на 10 працэнтаў кошту тарыфных планаў кругласутачнага доступу ў інтэрнэт.

З 1 сакавіка новы кошт тарыфнага плана «Дамасед» (1024/512 Кбіт/с) будзе складаць 59 400 рублёў (раней было 54 тысячы), «Дамасед плюс» (2048/512 Кбіт/с) — 88 тысяч рублёў (было 80 тысяч), «Дамасед XXL» (3072/512 Кбіт/с) — 110 тысяч рублёў (100 тысяч). Новы кошт пакета «Эканом» — 63 тысячы рублёў, пакета «Універсал» — 107 500 рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПЕНСІЯНЕР ПАДПАЛІЎ СВОЙ ДОМ

Са сваіх 72 гадоў жыцця пенсіянер з вёскі Каменка Дзяржынскага раёна 18 гадоў па сукупнасці правёў у месцах пазбаўлення волі. Адпаведна, нораў меў яшчэ той. Да прыкладу, за некалькі дзён да здарэння ён... напаў на аднавяскоўку з нажом і пашкодзіў ёй лёгкае.

— А пражываў мужчына разам са сваёй дачкой, якой увесь час паўтараў: маўляў, мне ўсё роўна пагражае турма, але дом табе я ў любым выпадку не пакіну, — расказала старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк. — Відавочна, пенсіянер у нейкі момант і вырашыў, што настаў той самы момант пазбавіць роднае дзіця нерухомай маёмасці. Прачнуўся раніцай, устаў з ложка ды і падпаліў яго. Выйшаў на вуліцу і пачаў назіраць. Дзіўны малюнак заўважылі суседзі: з вокнаў хаты ідзе дым, а дзед насупраць стаіць і назірае. Паспрабавалі патушыць, а той не дае: маё, няхай гарыць! Ці варта казаць, што пенсіянер быў нападпітку.

Дом пажарныя ўсё ж адстаялі, у ім толькі пасцельныя прыналежнасці паспелі згарэць ды сцены закурадыміла. Зараз сам пенсіянер-рэцыдывіст знаходзіцца пад следствам: яму пагражае да сямі гадоў пазбаўлення волі па артыкуле «Нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПЕРШАЯ ПА МІЖНАРОДНАЙ ЖУРНАЛІСТЫЦЫ

Пад назвай «Міжнародная журналістыка-2012: сучасны стан і кірункі развіцця» прайшла ў Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта навукова-практычная канферэнцыя.

Гэта была першая міжнародная канферэнцыя па беларускай міжнароднай журналістыцы. Ініцыятарамі яе правядзення выступіла кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі БДУ. Ідэя была падтрымана ўсімі вядучымі сродкамі масавай інфармацыі краіны. Іх прадстаўнікі разам з выкладчыкамі і студэнтамі прынялі актыўны ўдзел у працы канферэнцыі. У ходзе канферэнцыі было грунтоўна абмеркавана шырокае кола пытанняў, якія маюць непасрэднае дачыненне да інфармавання насельніцтва краіны ў поўным аб'ёме па злабадзённых падзеях у свеце.

**Леанід ТУГАРЫН**.

## ДВАЙНАЯ РЭЎНАСЦЬ

У Аршанскую гарадскую бальніцу з дома 38-гадовай жыхаркі гарадскога пасёлка Арэхаўск на «хуткай» прывезлі двух параненых нажом мужчын.

Высветлілася, што нажавыя раненні шыі гэтым пацярпелым (1983 і 1985 гадоў нараджэння) з-за рэўнасці прычыніў 52-гадовы мужчына. Яго затрымалі. Усе трое — непрацуючыя жыхары названага пасёлка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НЕНАЗОЙЛІВЫ СЭРВІС

**Калі, напрыклад, вы — вясковы жыхар, і вам захацелася аднавіць (перафарбаваць у іншы колер) любімы світар, хутчэй за ўсё, вы сутыкняцеся з пэўнымі цяжкасцямі... Знайсці «бытоўку» з шырокім спектрам паслуг у глыбінцы няпроста. Сёння раённыя камбінаты бытавога абслугоўвання часам нясуць вялікія страты, забяспечваючы ў вёсках прыём абутку ў рамонт, бялізны ў пральню і адвозячы заказы ў горад... Як кампенсаваць страты і захаваць структуру бытавога абслугоўвання, такую патрэбную вясковым жыхарам? Выйсце бачыцца ў пашырэнні сферы паслуг, выхадзе за «межы» традыцыйнага іх пераліку, перапрафіляванні ў залежнасці ад попыту, які відавочна адрозніваецца ад таго, што быў 10 гадоў таму. Галоўнае — мець добрыя ідэі. Атрымаецца іх рэалізаваць — з'явяцца і грошы.**

■ Мясцовая ініцыятыва

## ПРЫВАТНІК У ВЁСКУ НЕ ІДЗЕ

**Абзваніла з дзясятак сельсаветаў у розных раёнах Брэсцкай вобласці, і толькі ў адным сказалі, што ў іх ёсць прыклад аказання бытавых паслуг прыватнікамі. Таму і накіравалася ў пасёлак Ленінскі Жабінкаўскага раёна. У населеным пункце з такой знакавай для XX стагоддзя назвай аказалася тры прадпрымальнікі, якія зарабляюць на жыццё паслугамі аднавяскоўцам і жыхарам навакольных вёсак.**



Аліна ПРАКАПОВІЧ.

Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

У самім Ленінскім жыве паўтары тысячы чалавек, а насельніцтва сельсавета складае 2,5 тысячы жыхароў. І калі індывідуальныя прадпрымальнікі падавалі заявы на арэнду памяшкання, кіраўніцтва раённага камбіната бытавога абслугоўвання сустрэла ідэю без энтузіязму. Вядома, бытавікі пабойваліся канкурэнцыі. Але мясцовая ўлада вырашыла падтрымаць прыватнікаў. Пра гэта расказаў старшыня сельвыканкама Юрый Кадоліч. Як паказаў час, у сваім рашэнні ён не памыліўся. Працы хапае ўсім, а канкурэнцыя толькі спрыяе якасці. У Ленінскім адкрыты прыёмны пункт раённага камбіната бытавога абслугоўвання. Пералік яго паслуг складае паўтара дзясятка пунктаў.

А на першым паверсе будынка сельсавета невялікі пакойчык здымае Аліна Пракаповіч. Яна — майстар прыватнай цырульні, скончыла вучэбны цэнтр Сяргея Вайцяхоўскага ў Мінску. Працавала спачатку ў сталіцы, потым у Брэсце. Апошнім часам здымаць жыллё і плаціць арэндную плату за памяшканне стала не пад сілу, вось і вырашыла вярнуцца дадому. Жыве ў бацькоў, а на ежу і адзенне, паводле прызнання Аліны, зарабіць можна. У майстра склалася сваё кола наведнікаў, некаторыя былыя яе кліенты нават з Брэста ездзяць — ад абласнога цэнтра да Ленінскага ўсяго 40 кіламетраў.

Абслугоўванне ідзе па папярэднім запісе. Кліентка Жанна Іванаўна сказала, што робіць прычоску ў Аліны ўжо год і мяняць цырульніка не збіраецца. Даход маленькай цырульні не вельмі высокі, таму што цэны тут адрозніваюцца ад гарадскіх. Асабліва шмат не заробіш, разважае Аліна Пракаповіч. І кошт паслугі не паднімеш, бо кліентаў адразу паменее. Добрая выручка ў цырульніка, як правіла, у сезон вяселляў, перад выпускнымі вечарамі. Тады, бывае, даводзіцца пачынаць работу ў чатыры гадзіны раніцы.

Аліна — не проста прыгожая дзяўчына, але і аптыміст па натуры. Яна лічыць, што і ў сельскім населеным пункце з яе спецыяльнасцю пражыць можна. Толькі шкада, што ў іх пасёлку няма, напрыклад, кавярні, куды ўвечары можна было б зайсці прыстойнай моладзі. Памяшканне для гэтага ёсць — былы бар, але няма ахвотных давесці яго да ладу і адчыніць установу грамадскага харчавання. І ўсё ж, калі такі чалавек неўзабаве знойдзецца, то Ленінскі зможа пахваліцца ледзь не поўным наборам якасных паслуг насельніцтву.

Напрыклад, швачку Алену Галаўчук ведаюць далёка за межамі ўласнага пасёлка. Алена Сцяпанаўна выконвае рамонт адзення і іншых швейных вырабаў. Да яе нясуць сукенкі, касцюмы, курткі, паліто. Але на гэтых паслугах, як упэўнілася майстар, на жыццё і блізка не заробіш. Таму яна займаецца справай, якая яе заўсёды цікавіла — «апранае» вокны. У каталогу Алены Галаўчук змяшчаюцца дзясяткі ўзораў цюлю, штор, ламбрыкенаў для ўсіх відаў пакояў. Кожнаму наведніку яна прапануе эксклюзіўны варыянт у залежнасці ад велічыні акна і пакоя, ад колеру мэблі і шпалераў. Адным словам, людзі даўно ацанілі яе майстэрства, таму і едуць да Алены Сцяпанаўны з райцэнтра, з навакольных вёсак. «У мінулыя гады было шмат навасёлаў, — расказвае майстар. — І ўсім, вядома, патрабавалася «афарміць» вокны, таму і заказаў хапала. Цяпер, як вядома, будаўніцтва запаволілася, грошай у людзей стала менш. Некаторыя гаспадыні, наколькі я ведаю, самі шыюць шторы, як умеюць. Хоць няякасна, але ж бясплатна».

І Алена Галаўчук у сувязі з эканамічнымі ўмовамі змяніла свой статус з індывідуальнага прадпрымальніка на рамесніка. Застаўся адзін фіксаваны падатак, які яна рэгулярна выплачвае, ды арэндныя выдаткі. Тут і сельвыканкам пайшоў насустрач: ёй памянялі пакойчык на меншы, каб менш было плаціць за арандаваныя метры.

У Алены Сцяпанаўны за гады таксама склалася сваё кола кліентаў. Хто аднойчы рамантаваў у яе адзенне, нешта шыў, той абавязкова прыходзіць зноў. «Я не магу дазволіць сабе зрабіць абы-як, — кажа швачка. — Мы ж усе побач жывём, штодня сустракаемся. Калі чалавек мне прынясе памяняць «маланку» ў куртцы, а я заўважу там яшчэ дзірачку на шве ці нейкі іншы недахоп, то, вядома, ж выпраўлю, хоць мне замаўлялі толькі адну паслугу».

Яшчэ ў Ленінскім працуе майстар па рамонце абутку Віктар Карпук. Ён наогул з Кобрына кожны дзень ездзіць. Праўда, заспець Віктара Мікалаевіча не ўдалося: у дзень майго прыезду ён затрымаўся дома. Але чалавек пяць, з кім давялося перамовіцца, аднадушна расхвалілі майстра. «Робіць хутка, якасна, цэны ніжэйшыя за гарадскія», — заўважыла адна жанчына. «Чалавек вельмі сціплы і добрасумленны», — дадала другая. «Вельмі зручна: ідзеш на працу — здаеш абутак, па дарозе дадому забіраеш», — падсумавала трэцяя. А гэта азначае, што недахопу кліентаў ў Карпука няма. Увесь пасёлак рамантуе ў яго абутак. Ну і былыя кліенты, якія ведаюць майстра па Кобрыне, па-ранейшаму вязуць да яго заказы.

Чаму ў Ленінскім ёсць прадпрымальнікі, якія займаюцца бытавымі паслугамі, а ў іншых мясцінах такіх знайсці цяжка? Напрыклад, у аграгарадку Белавежскі Камянецкага раёна прыватнікаў, якія займаліся б бытавымі паслугамі, наогул няма. Толькі адзін чалавек, які раней адкрыў краму, цяпер збіраецца паспрабаваць аказваць цырульніцкія паслугі і ўжо рыхтуе для гэтага памяшканне... Відаць, таму, што ў вяскоўцаў у цэлым невысокі даход, і людзі баяцца рызыкаваць — пачынаць сваю справу. Яшчэ, як давялося пераканацца падчас размоў з майстрамі з Ленінскага, праца ў іх далёка не з лёгкіх, а даходы невысокія. А старшыня Ленінскага сельвыканкама Юрый Кадоліч лічыць так:

— Па-першае, чалавек, які вырашыў займацца такой дзейнасцю, павінен умець думаць, быць смелым, здатным да рызыкі. Гэта вам не з Украіны тавар прывезці і перапрадаць — асабліва розуму на такое не трэба. Напрыклад, наша Алена Галаўчук знайшла сваю нішу, узялася за цікавую для яе справу, і сёння амаль у кожным доме пасёлка ўбачыш на вокнах яе шторы. Як такім людзям не пайсці насустрач? Таму другая ўмова наяўнасці падобных прадпрымальнікаў — падтрымка мясцовай уладай прыватнай ініцыятывы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Жабінкаўскі раён*

■ Свая ніша

# ПАСЛУГА З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ

**На Гродзенскім райбыткамбінаце занялiся зусім не традыцыйнай для бытавікоў дзейнасцю, а менавіта вырабам жалезабетонных агароджаў, нарыхтоўкай драўніны, паслугамі па апрацоўцы зямельных участкаў... Чым гэта абумоўлена? І ці вартая аўчынка вырабу?**



Пашыў рабочага адзення ў КПП «Верцялішкі».

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

У склад райбыткамбіната, акрамя атэлье «Маладзёжная мода», цырульні і цэха рытуальных паслуг у Гродне, уваходзіць 20 структурных падраздзяленняў у сельскай мясцовасці. Разам з **начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела Марынай КУДЗЕЛЯЙ** накіроўваемся ў Азёры.

— У былыя часы, — прыгадвае **загадчыца тутэйшага комплекснага прыёмнага пункта Святлана ЮРЭЧКА,** — нават чэргі былі сярод ахвотных пашыць адзенне. Цяпер, калі дэфіцыту тавараў не існуе, індывідуальны пашыў таксама прапануецца, але заказаў няшмат, перавага аддаецца гатовай прадукцыі ў крамах ці на рынках. Больш запатрабаваны паслугі па рамонце адзення, зарабляюць таксама на продажы ўласных вырабаў райбыткамбіната (трыкатаж, пасцельная бялізна), парфумерыі, тавараў бытавой хіміі, грунту для прысядзібных участкаў. Зрэшты, гэта мізэр у параўнанні з асноўнай «нішай» Азёрскага КПП — масавым пашывам форменнага і рабочага адзення. Сярод заказчыкаў — сельгаспрадпрыемствы, буйныя абласныя аб'яднанні (напрыклад, апошняя партыя куртак выраблялася для работнікаў «Гроднааблтэлекама»).

Патрабаванні да ўзроўню гэтай прадукцыі вельмі сур'ёзныя, у прыватнасці, сёння наяўнасць святлоадбівальных элементаў абавязковая. Для таго, каб атрымаць такія заказы, трэба быць канкурэнтаздольным па якасці і цэнах. Калі райбыткамбінат выйграў тэндар, то **азёрскім швачкам Валянціне ДРАБЫШЭЎСКАЙ, Ірыне ПАРЧЭЎСКАЙ і Вользе ЧУБАРАВАЙ** гарантавана вельмі напружаная праца. Прычым не толькі ім, але і **Галіне ГОЙДЗЬ, Ганне КОЗІЧ і Наталлі ДЗЯТЧЭНІ з КПП «Верцялішкі».**

Хаця адной толькі швейнай справай абавязкі сельскіх бытавікоў не абмяжоўваюцца. І ў Азёрах, і ў Верцялішках працуюць цырульні, па пэўных днях сюды прыязджае майстар па рамонце абутку, прымаюцца таксама заказы на паслугі хімчысткі, пральні,на рамонт тэлевізараў і іншай бытавой тэхнікі. Ёсць заказы — прыедзе фатограф. Акрамя таго, работнікі кожнага КПП, згодна з графікам, рэгулярна ездзяць па вёсках замацаванай за імі зоны абслугоўвання — прымаюць ад мясцовых жыхароў заказы, прапануюць шырокі асартымент тавараў, у тым ліку і ўласнай вытворчасці. Па сутнасці, працуюць з дастаўкай на дом. Напрыклад, зімой даволі папулярныя ўцепленыя камізэлькі, якія майстрыхі ў Верцялішках шыюць не горш, чым на спецыялізаванай фабрыцы.

— Асабліва запатрабаваная сёння спецыяльнасць швачкі. Яны нам (па тых заказах, што сёння маем) патрабуюцца ў любой колькасці, па тры-чатыры на кожны комплексны прыёмны пункт. Аднак цяжка, на жаль, прыгадаць, калі да нас на працу прыходзілі выпускніцы Гродзенскага каледжа бытавога абслугоўвання насельніцтва, — кажа **дырэктар Гродзенскага райбыткамбіната Васіль КАВАЛЬЧУК.** — Гэта звязана не толькі з зарплатай (заробак залежыць ад выпрацоўкі, і ў некаторых швачак ён цяпер складае два мільёны рублёў, а то і больш), але і з характарам працы. У прыватнікаў швачку ставяць на адну аперацыю: напрыклад, прышываць маланкі ці гузікі, а ў нашай сістэме, на пашыве таго ж спецадзення, трэба зрабіць усё ад пачатку да канца і выпусціць гатовую рэч. Гэта больш складана, затое праца творчая, і менавіта ў нас можна стаць сапраўдным прафесіяналам.

Увогуле выгадных паслуг у бытавым абслугоўванні вяскоўцаў сёння няма, усё гэта там стратнае. Па той простай прычыне, што гэтыя паслугі мы павінны да кліентаў давезці, а адсюль і затраты. Прытым нашы расцэнкі не могуць перавышаць гарадскія. У выніку кожны комплексны прыёмны пункт нясе страты, якія цяпер ужо не кампенсуюцца, як раней, бюджэтнымі датацыямі. І таму няма перспектывы ў тых, хто спадзяецца толькі на існуючыя падатковыя льготы і субсідыі. А адсюль і галоўная задача — развіваць тое, што дае прыбытак, і такім чынам перакрываць страты па сацыяльна значных паслугах вяскоўцам. Бо хто, акрамя нас, будзе працаваць у гэтым кірунку? Сярод прыватнікаў (як мы ўжо пераканаліся) ахвотнікаў няшмат.

Адна з першых такіх «ластавак» — гэта выраб і ўстаноўка драўляных агароджаў на бетонных палях, што камбінат арганізаваў пры падтрымцы раённых улад. Мяркую, ніхто не крыўдуе на якасць гэтай прадукцыі. А мы, адчуўшы выгаду, сталі імкнуцца праявіць сябе і ў іншых «нішах», дзе ёсць прыбытак. І зноў не без поспеху. Наладзілі выраб і жалезабетонных агароджаў, стварылі будаўнічую брыгаду, асвоілі выпуск тратуарнай пліткі (пяць відаў). Восем чалавек па дагаворы з лясгасам займаюцца сёння санітарнымі высечкамі і нарыхтоўкай драўніны. Акрамя таго, вырабляем малыя архітэктурныя формы (лаўкі, вазоны), прадастаўляем транспарт для грузаперавозак і тэхніку для апрацоўкі прысядзібных участкаў. Калі ж у нас з'явіўся добры зваршчык, то наладзілі выпуск кантэйнераў для адходаў. Прычым для іх мы яшчэ робім пляцоўкі, агароджу. Можам таксама аказваць паслугі па абсталяванні дзіцячых гульнявых пляцовах, зносе аварыйных дрэў, а для актавай залы аднаго з ліцэяў не толькі пашылі кулісы, але і цалкам абсталявалі сцэну.

Дарэчы, у Гродзенскім райбыткамбінаце вырабляюць нават спальныя мяшкі, пракат якіх (а таксама палатак) арганізаваны ў пасёлку Сапоцкін, у зоне Аўгустоўскага канала. Летам гэты турыстычны інвентар літаральна нарасхват, прычым заказаць яго можна ў любым комплексным прыёмным пункце камбіната — заказ даставяць з Сапоцкіна без даплаты за транспартныя расходы.

...Вось так пацвярджаецца на практыцы народная мудрасць, што пад ляжачы камень вада не цячэ. А неўзабаве, мажліва, у бытавікоў з'явяцца і іншыя ідэі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Форма і змест

# БЫТ ЦІ НЕ БЫТ?

**У Магілёве на базе старых дамоў быту ствараюцца новыя сэрвісныя цэнтры. Будынак на вуліцы Цыялкоўскага, 10 ведаюць усе старажылы мікрараёна «Мір»: цяпер ён мае новы выгляд, але змест застаўся ранейшым — аказанне паслуг насельніцтву.**

Дамы быту, узведзеныя ў савецкія часы, можа, і не радавалі вока сучасным аздабленнем, але ўсё ж давалі магчымасць грамадзянам нядорага рамантаваць розную хатнюю драбязу, а майстрам — працаваць і зарабляць сабе на жыццё.

Час змяніўся, але патрэбы ў людзей засталіся ранейшыя. Кажуць нават, што ў сувязі з крызісам попыт на рамонт абутку, адзення, тэхнікі яшчэ і павялічыўся: правільна, калі ў эканоміцы (у тым ліку і хатняй) цяжкасці, больш выгадна рамантаваць старое, чым набываць новае.

Гэта, зразумела, танней, а вось ці прасцей? Тым больш у Магілёве, дзе цэнтральны дом быту знаходзіцца на рэканструкцыі, а вяртанне прадпрымальнікаў пад яго дах абяцаюць праз некалькі гадоў. Таму магілёўскія ўлады вырашылі актыўна развіваць бытавыя паслугі ў мікрараёнах.

— Гэта правільнае рашэнне — стварэнне сэрвісных дамоў быту, — каментуе **дырэктар Магілёўскага гарадскога цэнтра развіцця малога прадпрымальніцтва Павел МАРЫНЕНКА.** — Іх гаспадар павінен быць не толькі зацікаўлены ў атрыманні прыбытку, але і разумець, што сфера бытавых паслуг ніколі не будзе высокарэнтабельнай справай. Аднак яна вельмі патрэбна людзям.

У 2010 годзе гарадскія ўлады перадалі цэнтру развіцця малога прадпрымальніцтва два старыя дамы быту, якія сёння працуюць.

— Мы выдаткавалі на абодва будынкі 700 мільёнаў рублёў, — расказвае Павел Марыненка. — Частка гэтых грошай — з абласнога бюджэту, частка — нашы ўласныя сродкі, якія мы атрымліваем ад здачы маёмасці ў арэнду.

Будынак на Цыялкоўскага выглядае добра: тут прывялі ў парадак фасад, разабраліся з інжынернымі сеткамі, замянілі вокны і дзверы, адрамантавалі падлогі і г.д. Рамонт унутраных памяшканняў робіць сам арандатар, а вось сеткі і праводка — гэта цалкам праблемы гаспадара. Яшчэ не ўсё завершана, але на сённяшні дзень зайсці ў сэрвісны цэнтр прыемна.

Крызіс паўплываў не на планы цэнтра па развіцці малога прадпрымальніцтва, а на тэрміны іх выканання.

— Другі паверх мы зрабілі толькі часткова, але да дня горада, які адзначаецца разам з Днём Незалежнасці краіны, новы дом быту павінен быць завершаны, — кажа падчас «экскурсіі» Марыненка.

На першым паверсе — самыя запатрабаваныя паслугі. **Майстэрня па рамонце адзення «З іголачкі»** месціцца ў прасторным светлым памяшканні. За машынкамі — дзве работніцы.

— Люты — не самы лепшы месяц для рамонту адзення і абутку: вясна яшчэ не прыйшла, а зіма ўжо завяршаецца, — тлумачыць Людміла. — Але сэнс працаваць



Фота Ілоны ІВАНОВАЙ.

ёсць: учора абслужылі каля дзясятка кліентаў, а бывае і ўдвая болей. Нашы цэны залежаць ад аб'ёму працы: я цяпер перашываю футра — гэта можа каштаваць некалькі соцень тысяч, а самая танная аперацыя — 2 тысячы рублёў.

**Адразу дзве майстэрні па рамонце абутку** прапануюць свае паслугі: адна прыватная, другая дзяржаўная. Майстар прыватнага «Тэмпу» працуе некалькі гадоў, мае сталых кліентаў і таксама чакае наплыву з першымі прыкметамі вясны. Рамонт тут каштуе ад 5 да 70 тысяч рублёў.

Яго калега ў майстэрні насупраць — жанчына.

— Мы дапамагаем людзям жыць, — упэўнена Тацццяна Іванаўна. — У нас добразычлівае стаўленне да кліентаў, а цэны невысокія.

Упрыгажэннямі людзі будуць цікавяцца ва ўсе часіны, упэўнены ў **ювелірнай майстэрні**, якая заняла некалькі памяшканняў дома быту на другім паверсе.

— Кліенты ў нас ёсць — гэта жыхары навакольных мікрараёнаў, — кажа супрацоўніца Аксана. — Мы рамантуем ювелірныя вырабы, робім новыя — з золата і серабра заказчыка. Цэны розныя, але прымальныя: рамонт каштуе ад 7 да 60 тысяч рублёў, а складаныя вырабы могуць каштаваць і паўмільёна. Людзі да нас ідуць, і мы думаем, што пасяліліся тут надоўга.

— Палітыка гарадскіх улад — пераважнае права на памяшканні тым, хто аказвае бытавыя паслугі, — тлумачыць кіраўнік цэнтра развіцця малога прадпрымальніцтва. — Гэта дзейнічае на ўсёй тэрыторыі Магілёва, і да нас любы чалавек, які працуе ў сферы бытавых паслуг, можа прыйсці і быць упэўненым, што яму знойдзецца месца для працы ў адным з нашых сэрвісных цэнтраў.

Раней трэць памяшканняў тут пуставала. І нават самі прадпрымальнікі-бытавікі на пачатку пераўтварэнняў былі настроены песімістычна: маўляў, нічога не атрымаецца, будынак застанецца «мёртвым». Цяпер жа, насуперак змрочным прагнозам, засталося толькі 8% вольных плошчаў. Павел Марыненка не сумняваецца, што ў будучым сэрвісны цэнтр стане своеасаблівым цэнтрам мікрараёна, напаўненне якога вызначаць час і людзі.

Сёння найбольш папулярныя віды бытавых паслуг — гэта ўсё ж рамонт абутку і адзення, і яшчэ хімчыстка. Хоць у доме быту ёсць таксама аддзяленне пошты, якое нязменна прыцягвае сюды людзей, а яшчэ ламбард і нават кабінет псіхалагічнай разгрузкі.

Магілёўскі гарвыканкам сваім рашэннем вызначыў абавязковы пералік паслуг для тыпавога дома быту. Для таго, каб на Цыялкоўскага, 10 быў поўны камплект, сюды яшчэ трэба прыцягнуць прадпрымальнікаў для аказання рытуальных паслуг, хімчысткі і рамонту гадзіннікаў. Нягледзячы на тое, што сотавыя тэлефоны даўно замянілі гадзіннікі, усё ж і пра такі від рамонту людзі пытаюцца. Увогуле з цягам часу ўсё мяняецца: напрыклад, з распаўсюджаннем сучаснай бытавой тэхнікі страцілі актуальнасць пральні. Затое рамонт парасонаў і выраб ключоў застаюцца запатрабаванымі ўжо шмат гадоў. А на першы план выходзіць сэрвіснае абслугоўванне камп'ютараў і тэлефонаў.

— Калі ў Амерыцы быў глыбокі крызіс, адным са спосабаў выкараскацца з эканамічнай яміны стала аказанне паслуг, — расказаў Павел Марыненка. — Такім чынам ствараліся новыя працоўныя месцы, зарабляліся грошы. Так што паслугі застануцца назаўсёды. Вось толькі іх сутнасць з цягам часу будзе мяняцца.

**Ілона ІВАНОВА**

# ДРАПЕЖНЫЯ, РУЧНЫЯ, ПЯШЧОТНЫЯ

Першае, што кідаецца ў вочы, калі бачыш гэтых «адмоўных»герояў нашых казак, — яны дагледжаныя, прыгожыя, з круглымі бакамі. Густая поўсць ажно зіхаціць на сонцы. Таму і прыходзіць думка: хіба можа сытая жывёла быць небяспечнай? А калі яна яшчэ і выгадавана ў хатніх умовах?..

Два гады таму Сяргей Селях знайшоў у лесе пакінутых, яшчэ невідушчых шчанюкоўваўчанят. Маці-ваўчыца не прыходзіла да логава некалькі дзён. Ці не напаткала яе часам паляўнічая куля, губляўся ў думках Сяргей і вырашыў не пакідаць малых на пагібель. А тым больш забіваць... За што? Яны ж не вінаватыя, што прырода-маці зрабіла іх драпежнікамі. Прырода — не чалавек, нялюбых дзяцей у яе няма. Добра, што ў гэты самы час дома ў сучкі Айны былі свае шчанюкі і Селях падклаў ваўчанят пад сабаку-маці.

— Цікава было назіраць, як «падкідышы» гадаваліся разам са зводнымі братамі і сёстрамі. Айна гулялася з імі, як з роднымі, аблізвала, грэла, — прыгадвае Сяргей пачатак воўчага суседства. — Наша сям'я моцна прывязалася да жывёл, дзеці прыдумалі ім мянушкі, забаўляліся, не мелі ніякага страху да іх.







Аднак ваўкі растуць хутка. У першую восень Шэрка і Вітоша набылі выгляд сапраўдных драпежнікаў. Невысокага ягдтэр'ера Айну пачало злаваць, што прыёмныя гадаванцы ў два разы большыя за яе, не разумела іхніх жартаў і забаў. Прыйшлося гаспадарам вызначаць ваўкам месца ў вялікай клетцы. А каб Вітоша і Шэрка не сумавалі і не дзічэлі, у спакойны вечаровы час з імі ладзілі прагулкі ў поле — яно пачынаецца акурат за хатай.

Цяпер у Селяха не проста дом і падворак — аграсядзіба. Ён пчаляр і вызначыў для сябе цікавую — «мядовую» форму вясковага турызму (знаёміць гасцей з жыццём пчол і тэхналогіяй утрымання і развіцця пчалярскай гаспадаркі). Ахвотных прыехаць на пчальнік і пачаставацца мёдам цяпер нямала. Дарэчы прыйшліся на сядзібе і Вітоша з Шэркай. Экзатычныя жывёлы — частка турыстычнага маршруту, адна з разынак сядзібы «Гаенскія вытокі». Ваўкі спакойна рэагуюць на здзіўленыя воклічы вакол клеткі. Ніякай агрэсіі. Вітоша хаваецца ў кут. Шэрка трэцца аб загародку, да яе можна ціхенька дакрануцца.

— Характары ў нашых жывёл розныя. Калі Вітоша больш асцярожны і палахлівы, дык Шэрка, наадварот, гуллівы, задзірысты і дапытлівы воўк, — зазначае Сяргей. — Паміж сабой яны добра ладзяць, і гэта нам вельмі даспадобы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Лагойскі раён*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Пісьмо з каментарыем

# «КРАНШТЭЙНЫ ЁСЦЬ — НЯХАЙ ПАВЕСЯЦЬ ЛІХТАРЫ. І МОГУЦЬ НЕ ЎКЛЮЧАЦЬ»,

## або Пра living рознае пакрыху і пра адно і тое ж — па-рознаму

**«Больш за 2,5 года па вуліцы Паўночнай у г.п. Смілавічы з апор асвятлення былі знятыя два ліхтары — у рамонт работнікамі Чэрвеньскай ЖКГ. Я неаднаразова звяртаўся ў Смілавіцкі ўчастак ЖКГ з нагоды ўстаноўкі ліхтароў. Абяцалі, але не ўстанавілі». Такі допіс даслаў у рэдакцыю жыхар Чэрвеньшчыны. Дастаткова хутка на яго рэдакцыя атрымала і афіцыйнае рэагаванне з Чэрвеньскага раённага выканаўчага камітэта. Мае сэнс прывесці яго даслоўна, паколькі па сваім аб'ёме яно супадае з пытаннем чытача. Дык вось, па сутнасці: «згодна з інфармацыяй, якая паступіла ад УП «Чэрвеньская ЖКГ», сёння па вуліцы Паўночнай у г.п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна гарыць 10 ліхтароў, што дастаткова для асвятлення вуліцы. Сацыяльны стандарт захоўваецца».**

Як бачна, тры радкі займае чытацкі допіс, столькі ж — адказ на яго. Забягаючы наперад, зазначым, што заяўнік застаўся апошнім не задаволены і, паводле яго слоў, рыхтуе чарговыя запыты ў іншыя інстанцыі ўсё па тым жа пытанні. Справа яшчэ і ў тым, што ў лісце канкрэтнае (нават не пытанне, а канстатацыя факта) займае, як ужо было сказана, некалькі радкоў. А амаль старонка камп'ютарнага тэксту пасля — падрабязны пералік месцаў, куды заяўнік звяртаўся са сваёй скаргай: рэдакцыю раённай газеты, раённую пракуратуру, двойчы — у Камітэт дзяржкантролю Мінскай вобласці. Гаворка пра пісьмовыя запыты, але ж былі яшчэ і тэлефанаванні. Паўсюдна распісаныя даты зваротаў, якія ў дужках суправаджаюцца аўтарскімі рэмаркамі: «1,5 месяца — праваparушэнне», «парушаны тэрмін», «парушаны тэрмін адказу», «парушаны тэрмін». Маецца на ўвазе тэрмін атрымання заяўнікам афіцыйнага рэагавання на свае запыты. Паўтаруся, гэты тэкст — на старонку. У канцы заклік: «давайце разам змагацца з бюракратызмам у нашай краіне!». І прапанова вынесці гэты зварот на ўсенароднае абмеркаванне. Нагадаю, гаворка ідзе пра два ліхтары. І колькі не перачытваў тэкст, не мог уцяміць: дык што ж галоўнае для аўтара ліста — вярнуць ліхтары ці пакараць чыноўнікаў, якія парушаюць тэрміны адказу заяўніку. Напрыклад, у адным выпадку «пратэрміноўка» склала пяць дзён...

Мы звязаліся з заяўнікам, каб удакладніць: дык што ж для яго найбольш важна? «Каб вярнулі ліхтары. І панеслі адказнасць чыноўнікі», — адказаў ён...

Закона аб зваротах грамадзян ніхто не адмяняў. Калі сапраўды ёсць парушэнне, вінаватая службовая асоба павінна несці адказнасць. З іншага боку, як нам падаецца, за простым злічэннем дат адпраўкі пытання і атрымання адказу не павінна губляцца галоўнае: вырашэнне ўласна самой праблемы. Рэдакцыйны вопыт сведчыць, што нават атрыманае раней вызначанага тэрміну афіцыйнае рэагаванне, часам можа аказацца звычайнай адпіскай. І так бывае. Магчыма, у папярэдніх адказах, якія атрымаў наш заяўнік, па нядбайнасці выканаўцаў, якія іх уласна і рыхтавалі, была дапушчана нейкая недакладнасць, што небеспадстаўна і зачапіла чалавека...

Заяўнік у размове спасылаўся на нейкі праект пяцігадовай даўніны, згодна з якім і манціраваліся тыя ліхтары, аспрэчваў, што сацыяльны стандарт выконваецца, хоць не мог патлумачыць яго сутнасць. Якія патрабаванні існуюць па асвятленні вуліц? У частцы забеспячэння сацыяльнага стандарту па ўдзельнай вазе асвятлення вуліц у сярэднім па краіне — не менш за 80 працэнтаў ад агульнай працягласці вуліц населенага пункта. У адпаведнасці з тэрытарыяльным узроўнем укаранення, які ўлічвае рознае развіццё інфраструктуры і шчыльнасць пражывання насельніцтва, узровень выканання сацыяльнага стандарту па ўдзельнай вазе асветленых вуліц у сельскіх населеных пунктах вызначаецца схемамі ўстаноўкі святлакропак па кожным населеным пункце. Схемы расстаноўкі святлакропак узгадняюцца сельскімі выканкамамі і зацвярджаюцца райвыканкамамі.

...Падчас размовы заяўнік згадваў ужо не пра два, а пра чатыры ліхтары. Навошта столькі — 14 ліхтароў на вуліцы?

— Кранштэйны ёсць — няхай павесяць. І могуць не ўключаць.

— Дык а сэнс?

— Няхай вісяць. Прыйдуць іншыя, дбайныя чыноўнікі — яны і ўключаць асвятленне...

Мы яшчэ пагаварылі. Пра рознае патроху і пра адно і тое ж — па-рознаму. Пра сацыяльныя стандарты, эканомію (не за савецкім жа часам жывём), чыноўнікаў. Пераканаць суразмоўцу не атрымалася. Ён будзе яшчэ пісаць. У адказ толькі і засталося, што заўважыць: ужо столькі паперы спісана, столькі работнікаў у розных структурах адцягвалася для падрыхтоўкі адказаў... І відавочна, што гэта не апошнія высілкі службовых асоб будуць... Пра «ўсенароднае абмеркаванне», як тое прапануе аўтар ліста, і ўвогуле гаварыць не выпадае: прабачце, не той маштаб пытання. А як даведаўся, што заяўнік сам вазіў свае скаргі, тэлефанаваў за ўласны кошт, змарнаваў столькі часу, спытаў: ці не прасцей самому было б уладкаваць тое асвятленне, калі ў ім ёсць такая патрэба? «А некаторыя так і робяць», — сярдзіта кінуў у адказ пасялковец. Але ад планаў біць ва ўсе званы не адмовіўся...

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## Жанчына везла гераін




Супрацоўнікі ДАІ і аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Кастрычніцкага РАУС на Маскоўскім праспекце ў Віцебску затрымалі легкавую аўтамашыну. У салоне аўто знаходзілася беспрацоўная мясцовая жыхарка, у якой былі канфіскаваны 46 пакетаў з наркатычным сродкам (гераінам) агульнай вагой больш за 62 грамы. Аддзелам следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «РАДИОТЕХНИКА»**
**28 марта 2012 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «РАДИОТЕХНИКА»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника» за 2011 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития ОАО «Радиотехника» на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Радиотехника» о проделанной работе в 2011 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника» за 2011 год; распределения прибыли и убытков ОАО «Радиотехника».
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках общества за 2011 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
7. Об увеличении уставного фонда ОАО «Радиотехника» путем дополнительного выпуска акций, утверждение решения о выпуске акций ОАО «Радиотехника», о передаче акций дополнительного выпуска в собственность Республики Беларусь.
8. Об утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «Радиотехника».
9. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
10. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
11. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Государственному учреждению образования «Ясли-сад № 6 г. Ошмяны».

Место проведения собрания: Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Я. Коласа, 1 (актовый зал).

Начало собрания **в 15.00**. Время регистрации участников — в день проведения собрания **с 14.30.** В соответствии с решением наблюдательного совета список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 02 марта 2012 года.** Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться, начиная **с 20 марта 2012 года.**

УНП 500227068


■ Дыялогі «Звязды»

# Гарызанталі Вячаслава Шаршунова

**РЭКТАР Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі расказаў Звяздзе» пра сваё жыццё і працу, а таксама падзяліўся думкамі пра актуальныя праблемы.**



## ТЛУМАЧЭННЕ ДЛЯ «ЧАЙНІКАЎ»

Як сапраўдны навуковец, Вячаслаў Аляксеевіч пачынае гутарку з паказу сваіх нядаўна выдадзеных кніг. Навукова-практычны дапаможнік «Як знайсці і абараніць сваю інавацыю» — гэта важкі 600-старонкавы том пра інавацыйную творчасць у навуцы, тэхніцы, адукацыі і бізнэсе.

Шаршуноў знаходзіць у кнізе актуальную цытату беларускага навукоўца, акадэміка Ігара Нагорскага: «А ці не перакруцяць у нас саму сутнасць інавацыйнага развіцця? Такая небяспека ёсць!..»

— Так, гэта моднае слова, але не ўсе разумеюць яго сутнасць, хоць і ўжываюць дарэчы і недарэчы, — усміхаецца Вячаслаў Аляксеевіч у адказ на просьбу растлумачыць для «чайнікаў», што такое інавацыя. — Новае тэхнічнае рашэнне, вынаходніцтва — гэта яшчэ не інавацыя. Тут патрабуецца таксама пастаноўка на вытворчасць і атрыманне эфекту — эканамічнага, сацыяльнага, іншага. Гэта новая ідэя, якая рэалізавана, дае прыбытак і прыносіць карысць грамадству.

Мой суразмоўца кажа, што з усіх навінак, якія выдаюць творцы, толькі дзясятая частка мае практычнае ўжыванне, і з гэтай колькасці ў лепшым выпадку палова дае пэўны эфект. Таму называцца інавацыямі могуць не больш за 2-3% ад усіх новых ідэй.

## АСАБІСТЫЯ ПЫТАННІ

Вячаслаў Шаршуноў **нарадзіўся на Смаленшчыне.** Яго радзіма — невялікая вёска на памежжы з Віцебскай вобласцю, таму дабірацца да беларускай Оршы было зручней, чым у іншы бок. Маці была настаўніцай, а бацька — механікам на малочнакансервавым камбінаце. «Так што харчовыя тэхналогіі мне блізкія!» — робіць рэмарку цяперашні рэктар універсітэта харчавання.

— У той час я выбраў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, факультэт механізацыі. Наплыў абітурыентаў быў вялікі, бо ў год майго заканчэння школы скарацілі 11-я класы. У нас было 7 чалавек на месца. Да таго ж адмянілі льготы для медалістаў, і я здаваў усе пяць экзаменаў. Паступіў, і ўжо там ступіў у студэнцкую навуку.

З Горкамі аказаліся звязанымі і працоўны шлях, і асабістае жыццё.

— Я рускі, а жонка ўкраінка, мы пазнаёміліся студэнтамі, — расказвае Вячаслаў Аляксеевіч. — У асноўным я займаўся ў бібліятэцы, але аднойчы завітаў на танцавальную пляцоўку і пазнаёміўся з дзяўчынай, якая была вельмі падобная да актрысы Таццяны Самойлавай. Мы пажаніліся і разам ужо 38 гадоў. У нас два дарослыя сыны. А сакрэт сямейнага шчасця — разумець адно аднаго, саступаць, пазбягаць канфліктаў. Са свайго вопыту параю маладым людзям кахаць адно аднаго — і ўсё на гэтым.

## ДЭПУТАЦКІ ПАТЭНЦЫЯЛ

У Горацкай акадэміі ён прайшоў шлях ад асістэнта да рэктара, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. А потым прыйшоў час змен у краіне, і Вячаслаў Шаршуноў стаў дэпутатам.

— Я палічыў, што дэпутацтва ў Вярхоўным Савеце дасць больш магчымасцяў заваёўваць пазіцыі для акадэміі і Горак. Гэта цяпер, калі там рыхтуюцца «Дажынкі» і выдаткоўваюцца сродкі, добрая сітуацыя. А калі мне дасталася акадэмія на пачатку 90-х гадоў, там была вялізная колькасць аб'ектаў і маленькая кацельня на ўсіх.

Сваё дэпутацтва Вячаслаў Аляксеевіч называе вялікай школай жыцця. Ён навучыўся зносінам з самымі рознымі людзьмі: ад звычайных скаржнікаў, якія прыходзілі да яго на прыём у Горках, да кіраўніцтва краіны. Адначасова Шаршуноў працаваў у Мінску, у Міністэрстве сельскай гаспадаркі, а потым быў прызначаны намеснікам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Прычым больш узгадвае сёння не пра пасады, а пра цікавых асоб, з якімі давялося сустрэцца.

## ЯГО ЎНІВЕРСІТЭТ

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання Вячаслаў Шаршуноў узначальвае з 1 красавіка 2003 года. Такі першакрасавіцкі, але зусім не жарт. Рэктар узгадвае, што навучальнай установе запатрабаваліся змены — вонкавыя і ўнутраныя.

Увогуле ў яго кар'еры было нямала прыступак, але цяперашняй пасадай Вячаслаў Аляксеевіч задаволены:

— У мяне такая пазіцыя: усё добра, што ёсць, нельга шкадаваць, а трэба ісці далей. Гэта своеасаблівае мастацтва: плысці па гарызанталі, без спадаў глыбока ўніз і пад'ёмаў высока ўгору.

Шаршуноў шмат робіць у сваёй навучальнай установе: за кошт эканоміі, пазабюджэтных заробкаў. Мае сваю навуковую школу, дзеліцца са студэнтамі і калегамі сваім досведам, займаецца грамадскай працай (узначальвае абласную арганізацыю «Белая Русь») і, зразумела, выдае кніжкі.

— Напісаць кнігу — гэта доўгі працэс. Я пачынаў шмат гадоў таму: трапіць да мяне цікавая цытата альбо афарызм — запішу. Шмат рабіў у дэпутацкія гады: сям'я была ў Горках, і, пакуль некаторыя калегі наведвалі прыёмы ці займаліся іншымі справамі, я вечарамі пісаў. Безумоўна, тут патрэбны цярплівасць і ўседлівасць. Але іншых варыянтаў няма: асабліва для педагога, які хоча пакінуць спадчыну для выхавання наступных пакаленняў, падзяліцца з імі сваімі думкамі.

## ПРА СТУДЭНТАЎ

*— Вось і з намі падзяліцеся, калі ласка, сваімі думкамі.*

— Я гатовы адказваць на любыя пытанні, таксама, як і мае студэнты могуць свабодна спытаць у мяне ўсё, што хочуць, — гаворыць Вячаслаў Аляксеевіч. — У мяне тут адкрыты прыём штодня. Вось апошнім разам прыходзіў студэнт — хлопец з добрай сям'і, якая жыве ў адным з гарадоў Беларусі. Закахаўся без адказу, спрабуе пераканаць дзяўчыну, ездзіць да яе. Адсюль пропускі заняткаў і «хвасты». Ён вучыцца на другім курсе, і я лічу, што гэта вельмі небяспечны час для маладых людзей. Яны выйшлі ў асноўным з інтэлігентных сем'яў і безабаронныя перад жыццём. Добрыя хлопчыкі, пакуль вучацца ў школе, сядзяць дома, корпаюцца ў кніжках і камп'ютарах. Потым паступаюць і едуць з дому, а тут свабода, і ў 19-20 гадоў іх насцігае першае каханне. Што нярэдка прыводзіць да праблем у вучобе.

*— І як вы можаце дапамагчы студэнту, які закахаўся без узаемнасці?*

— Я найперш скарыстаю правы рэктара і падпішу хадайніцтва па допуску да ліквідацыі запазычанасцяў. Ды я пагутарыў з ім: калі дзяўчына выйшла на сцяжыну вайны, няхай ідзе далей сама...

*— Дзіўна: рэктар дапамагае вырашаць асабістыя праблемы студэнтаў.*

— Гэта яшчэ што! Даводзілася і жаніць! Некалькі гадоў таму бацькі прывялі цяжарную дзяўчыну: маўляў, ваш студэнт жаніцца не хоча. Паклікаў яго і сказаў: ты ж сябраваў з ёй і, калі так атрымалася, не трэба ламаць чалавеку жыццё. Урэшце пераканаў, а праз нейкі час яны прыйшлі да мяне разам, парай, а за ручку ён вёў маленькага хлопчыка. Такі цуд здарыўся! Вось гэта і ёсць тая вышэйшая адзнака, якую можна атрымаць у гэтым жыцці.

## ПРА НАВУКУ

*— Калі навокал віруе жыццё, навуковая праца ў бібліятэках і лабараторыях не падаецца чымсьці надзвычай цікавым...*

— Альберт Эйнштэйн: «Самае цудоўнае, што можна зведаць, — гэта адчуванне таямніцы. Яна — крыніца ўсякага сапраўднага мастацтва і ўсёй навукі...». У навуку нельга заганяць прымусова, тут павінны быць схільнасці. Упартасць, любоў да працы. І самае галоўнае: калі цябе вабіць навуковая таямніца, калі ты імкнешся яе разгадаць — табе ў навуку. Калі не — то лепш на рынак.

*— На рынку таксама некаму трэба працаваць. Вось толькі шкада, што ўсё часцей кажуць: маўляў, ён быў апошнім двоечнікам, а цяпер паспяховы бізнэсмен. На ваш погляд, добрая адукацыя ў нашым грамадстве ўсё яшчэ цэніцца?*

— А вы скажыце, калі ласка: хто стварае новыя тэхналогіі, машыны, прадукты, культурныя сімвалы? У любой сферы цэняцца людзі адукаваныя, яны і ідуць наперадзе. Яны ствараюць тое, што называецца прагрэсам — навукова-тэхнічным, эканамічным, культурным, сацыяльным. Калі так не будзе, дык развіццё спыніцца. І гандляваць на рынку не будзе чым.

*— На адукаваных людзях усё ж такі трымаецца свет?*

— Тыя, хто ідзе наперадзе, маюць, на жаль, не самы зайздросны лёс. Вось, напрыклад, Рудольф Дызель (нямецкі інжынер і вынаходнік. — **Аўт.**) скочыў у мора, давялі ж да такога. Пры жыцці ніхто гэтых людзей не прызнае, ужо пасля смерці пачынаюць маляваць іканастас генія. Але яны захоплены сваімі ідэямі і ідуць да іх, не збочваюць. І вядуць за сабой грамадства.

## ПРА НАСТАЛЬГІЮ

— Цяпер досыць складаны час — пераходу да новых каштоўнасцяў і складу думак, таму што ад савецкага ладу жыцця мы яшчэ не адышлі.

*— А вы пра тыя часіны ўзгадваеце з задавальненнем? Шкадуеце ўсё савецкае?*

— У Савецкім Саюзе, калі шчыра, было шмат чаго добрага, і грамадства тады выхоўвала людзей, і моладзь была іншай. Але і да таго стылю кіраўніцтва я ставіўся крытычна: ну як можна было дайсці да такога, што чалавека ўжо пад рукі вядуць, а ён усё кіруе краінай? Гэта быў нонсэнс для людзей са здаровым розумам. Гэтая грамадская крывадушнасць, паўсюдная, яна стала трагедыяй для народа.

Я, калі шчыра, не настальгірую па савецкіх часах. Таму што трэба жыць далей. Павінна ў грамадстве саспець разуменне таго, што трэба рухацца далей. Патрэбны і сілы для кансалідацыі, таму я і ўзначаліў «Белую Русь» у Магілёўскай вобласці. Грамадству патрэбен дыялог і, у выніку яго, канкрэтныя прапановы.

*— Якая будзе наша краіна ў будучыні?*

— Мне здаецца вельмі перспектыўным Мытны саюз, і калі да Беларусі, Расіі і Казахстана далучыцца яшчэ і Украіна, то гэта будзе разумнае і аптымальнае выйсце. Калі найперш будзе ўлічвацца эканоміка краін, тады адновяцца і культурныя сувязі паміж народамі.

## ПРА ВЫХАВАННЕ

— Бацькі чамусьці лічаць, што нехта павінен выхоўваць іх дзяцей. Нельга перакладваць гэту задачу на плечы іншых. Нарадзіў, выгадаваў і не забывайся на яго. Хаця, зразумела, жыццё рознае: маленькія дзеці — дробныя клопаты, вялікія дзеці — буйныя праблемы.

*— А навучальныя ўстановы якую ролю тут іграюць?*

— Яны даюць адукацыю, але выхоўваць павінны бацькі. Бацькам можна дапамагаць, накіроўваць іх, але адказнасць за выхаванне маладога пакалення ляжыць на іх плячах, і нічыіх іншых.

У нас тут таксама здараецца непаразуменні з бацькамі: маўляў, мы вам аддалі добрае дзіця, а праз два месяцы вы яго выключаеце за непрымальныя паводзіны. Але ці мы павялі гэта «дзіця» па так званых пажыўных месцах? Перш чым патрабаваць ад кагосьці, трэба спачатку спагнаць з сябе. Бацькі павінны адказваць за паводзіны свайго нашчадка ў грамадстве, такое маё перакананне.

*— Што ж, бацькі часта імкнуцца аддаць дзецям усё, што могуць, самае лепшае, але гэта часам не дапамагае...*

— Таму што лёгка ім даецца, нібыта само сабой. Калі бацькі імкнуцца аддаць апошняе дзеля дабрабыту дзяцей, гэта рэдка імі цэніцца. Яны гэта толькі потым пачынаюць усведамляць, калі сутыкнуцца з самастойным жыццём.

## ПРА БАЦЬКОЎ І ДЗЯЦЕЙ

— Праблема бацькоў і дзяцей заўсёды актуальная.

*— Тады як вы знаходзіце агульную мову з маладым пакаленнем?*

— Я заўсёды даступны для іх і прапаную дзяліцца сваімі праблемамі.

*— А якія цяпер праблемы для студэнтаў самыя важныя?*

— Грашовыя. Іх хвалюе аплата за вучобу, за пражыванне ў інтэрнаце. Акрамя грошай, яны цікавяцца і жыццём грамадства, палітыкай.

*— Іх меркаванні на гэты конт адрозніваюцца ад вашых?*

— Я да гэтага стаўлюся такім чынам: для моладзі павінен быць дыяпазон магчымасцяў выказацца, выкласці свой пункт гледжання. І з маладымі людзьмі заўсёды трэба размаўляць адкрыта і шчыра, тады яны зразумеюць тваю думку. Калі чалавек апускаецца на ўзровень натацый альбо жорсткіх патрабаванняў, гэта адразу выклікае непрыманне. Такіх момантаў трэба пазбягаць, калі хочаш знайсці агульную мову з маладымі.

*— Як вы ставіцеся да сённяшніх вельмі актуальных інфармацыйных тэхналогій?*

— Нармальна стаўлюся. Інтэрнэтам карыстаюся, у мяне ёсць нават асабістая старонка ў сетцы. Увогуле гэтыя навінкі тэхнічныя ў руках студэнтаў мне падабаюцца. Гэта ж новы ўзровень пазнання інфармацыйнага поля, увогуле — свету. І мне гэта не чужое.

*— А нярэдка здараецца наадварот: калі старэйшае пакаленне не прымае новае і сучаснае, прычым гэта датычыцца не толькі тэхнікі.*

— Мая пазіцыя ў дачыненні да гэтага і многіх іншых пытанняў такая: не трэба рабіць трагедыі! Не трэба чапляцца да маладых людзей, трэба быць памяркоўнымі. Асабліва ў дачыненні да дробязяў, не самых важных для жыцця. Калі кідацца ў бойку, дык за нешта важнае і значнае. А так — жывіце і радуйцеся!

## ПРА ЦЯЖКАСЦІ

*— А што вы скажаце наконт цяперашніх эканамічных цяжкасцяў? Гэта ж не дробязь.*

— Скажу, што ўвесь свет жыве не на падачках, а на зробленае. Так і мы павінны. А так мы намалявалі сабе бязвоблачную будучыню і атрымлівалі не забяспечаныя розумам, працай і ведамі прэферэнцыі. Таму так і здарылася. І ставіцца да гэтага трэба спакойна.

*— А вы адчулі гэта на сабе?*

— Так, як і ўсе звычайныя людзі. У мяне таксама грошы былі ў банку...

*— Што б вы параілі людзям рабіць цяпер?*

— Шукаць сабе належнае прымяненне, калі яны лічаць, што вычарпалі сябе на пэўным месцы працы і могуць зарабіць болей. Зразумела (я так і сваім выкладчыкам кажу), калі вы гатовы ўвайсці ў рыначную эканоміку з яе жорсткай канкурэнцыяй. Трэба шукаць, як выжыць у гэтых умовах. Спадзявацца больш на сябе, чым на кагосьці.

*— А якія часіны былі самыя складаныя ў вашым жыцці?*

— Найгорш было напрыканцы існавання Савецкага Саюза. Тады вялікім шчасцем было атрымаць заробак — «голы» аклад, без прэмій. А цяпер — гэта не край. Проста прызвычаіліся да лішніх грашовых знакаў у кішэні, а цяпер крычым «Ай-ай-ай!» Аднак, па маіх назіраннях, меней прадуктаў набываць у гіпермаркеце не сталі!

## ПРА ХАРЧАВАННЕ

*— Як рэктар універсітэта харчавання, вы, напэўна, навукова падыходзіце да ежы.*

— Сапраўднае мастацтва заўсёды актуальнае. Ужо першая вучнёўская работа Бялыніцкага-Бірулі была куплена Траццяковым — гэта вялікая падзея. Свята было невераготнае для яго, гэты факт адыграў сваю ролю ў яго лёсе. Бялыніцкі-Біруля — надзвычай тонкі пейзажыст, і цяжка з ім каго-небудзь параўнаць не толькі ў Расіі, у нас, але і ў Еўропе. Відаць, таму, што ён быў унікальны прыроднік, ён быў паляўнічы. Уявіце сабе: чалавек жыве ў Маскве, з ім здараецца інсульт, ён аказаўся ў ляжачым становішчы. І нягледзячы на тое, як супраціўлялася яго дачка і сябры, ён загадаў, каб яго везлі на дачу ў «Чайку» за 300 кіламетраў ад горада, у лес, у хату, дзе ніякіх дактароў няма. Як з такой хваробай апынуцца ў лесе? З вёскі раз на дзень прыходзіла жанчына, каб зрабіць хатнія справы: прыйдзе, пакорміць і пайшла да наступнага дня. А ён адзін быў ляжачы некалькі гадоў.

**— Вось што значыць — душа просіць...**

— Гэта яго і выратавала. Пасля гэтага інсульту ён яшчэ восем гадоў працаваў, пісаў — да другога інсульту. Ён глыбока верыў у прыроду, умеў жыць у прыродзе. Такіх глыбокіх прыроднікаў, такіх пейзажыстаў сёння няма. Сёння пейзажы пішуць у асноўным у майстэрнях. Калі надвор'е добрае — тады на прыроду. А ён пісаў у любое надвор'е.

**— Але ж быў пэўны час, калі Бялыніцкага-Бірулю ў Беларусі забылі, да яго ставіліся як да расійскага аўтара — маляў, там жыў.**

— З многімі добрымі мастакамі, пісьменнікамі гэта адбываецца. Геніі, таленты, класікі — іх забываюць на нейкі час. Тут адыгрывае ролю звер розных абставін. Па-першае, час, у які выпала жыць — непрасты. То рэпрэсіі пачаліся... Жукоўскі, яго сябра, у 23-м годзе выехаў з Расіі ў Польшчу, эміграваў, таму што першыя рэпрэсіі ў жывапісе леглі на яго. Гэта наш зямляк з Гродзеншчыны. Яго як замоўчалі з 23-га года, дык недзе да 80-х гадоў не ўзгадвалі ндзе гэтае імя, выстаў не было. Аказалася, што пры жыцці пра яго прэса, якая была вельмі прафесійная, шмат пісала. Многія адзначалі, што Жукоўскі пераўзышоў Левітана, што гэта сёння вяршыня расійскага пейзажу. І гэта ў той час, калі былі вялікія пейзажысты! Але збег акалічнасцяў, час паўплываў на тое, што яго забылі.

Альбо калі пачынаецца паласа бездухоўная жыцця, тады класічнае, духоўнае забываецца. Сёння мы гэта бачым. У нас адбываецца наплыў бездухоўшчыны, што ў жыцці, што ў мастацтве. Што зробіш, так грамадства развіваецца. Пад нейкім уплывам ідзе фармалізм, пад нейкім уплывам ідзе зварот да традыцыі і адраджэння духоўнасці. Вяртаюцца тады да такіх духоўных мастакоў, а потым зноў забываюць...

**— Але што ж ён не вярнуўся ў Беларусь, хоць быў да яе прывязаны?**

— Гэта вельмі зразумелая рэч: жыццё ёсць жыццё. Бялыніцкі-Біруля быў мастак. А мастак павінен валодаць тэхнікай, ён для гэтага павінен вывучыцца. А якія былі ў яго час умовы на радзіме для гэтага?.. Ён павінен быў ехаць і вучыцца ў вучэльні жывапісу, скульптуры і дойлідства, дзе працавалі выдатныя перадзвіжнікі, мастацтва якіх ён палюбіў. Ён павінен быў ехаць туды, жыць сярод прафесіяналаў, ад іх набірацца прафесійных, тэхнічных, жывапісных навыкаў. А калі прайшлі шэсць гадоў у вучэльні, адкрылася іншыя магчымасці, важныя для творцы: выставы, культурнае жыццё, музеі, кола людзей, без якіх ён не мог жыць. Але дзякуй Богу, калі чытаеш яго лісты, яго прозу, успаміны, ён усюды згадвае Беларусь, маленства на радзіме, як тут хараша, якая прырода. Я знайшоў яго аўтабіяграфію, дзе ён піша: «Я беларус». Ён марыў у 48-м годзе прыехаць у Беларусь і доўга жыць, прызнаваўся ў гэтым сваім сябрам. Але якраз у чэрвені 48-га года патанула яго адзінае дзіця, дачка Люба. Трагедыя для яго была неверагодная. Біруля не мог ужо адарвацца ад яе магілы...

**— Калі вывучалі яго жыццё і творчасць, ці былі моманты, калі вы рабілі для сябе нейкія адкрыцці ў ім? Тое, чаго вы ў гэтым чалавеку не чакалі і чым ён дагэтуль быў невядомы?**

— Калі ёсць вялікі мастак, геній, і да яго дакранаешся, то заўсёды будзеш у ім адкрываць новае, новае... Я ўглядаюся, учытваюся глыбока ў жыццё, мастацтва Бялыніцкага-Бірулі з 1989 года, калі выехаў па яго мясцінах. Важна, калі пішаш пра людзей, мець магчымасць адчуць, глыбока зразумець іх унутраны духоўны свет. Таму, калі я сутыкаюся з Бялыніцкім-Бірулем, увесь час адкрываю нешта новае. Нядаўна мне трапілі вершы, напісаныя ў «Чайцы», на дачы Бялыніцкага-Бірулі. У гэты час (1932 год) ён выехаў у саўгас «Гігант» — тады пасылалі мастакоў на будоўлі камунізма. Ён паехаў, а тыя, хто адпачываў у яго доме, пісалі яму лісты вершамі. У яго доме ў «Чайцы» жылі акцёры, мастакі, пісалі яму вершамі лісты. Я калі чытаў, убачыў і адразу ўспомніў многія моманты з яго жыцця, тую ж адозву Ільі Рэпіна, які сказаў пра яго: «дыханне чысціні і свабоды». Я падумаў, што ў самой «Чайцы» і наогул, дзе бываў Бялыніцкі-Біруля, там абавязкова адчувалася для ўсіх воля, свабода. Ён нейкім чынам фарміраваў атмасферу свабоды. І Біруля фарміраваў гэтую атмасферу і на сваёй дачы, і ў сваім доме на Варатнікоўскім завулку ў Маскве. Усюды, дзе б ён не жыў, ён быў свабодны чалавек. Таму заўсёды і збягаў з горада ў лес. У лесе была воля... Гэтыя факты выстройваюцца ў мяне ў асобную тэму. І гэтая тэма вельмі актуальная сёння, калі чалавек не можа дазволіць сабе раскошу быць цалкам вольным ад людзей, ад свету, ад цывілізацыі. Але мастак па прыродзе сваёй вольны. Ён піша так, як дыхае.

І калі ўзнікаюць пытанні наконт актуальнасці класічнага мастацтва, то мой адказ адзін: класіка заўсёды будзе актуальная, проста мы не актуальныя ў духоўным свеце. Нас лёс і час выкінула з духоўнага свету. Вечна актуальнае будзе класічнае мастацтва і Бялыніцкі-Біруля, як актуальная сама прырода.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

***Сёння мы змяшчаем урыўкі з эсэ Віктара Карамазава, якія дапамагаюць прыадкрыць таямніцу творчасці Вітольда Бялыніцкага-Бірулі.***

# Дождж і хлеб адраджэння

**Віктар КАРАМАЗАЎ**

*У кожнага чалавека ёсць радзіма. Яна жыве ў сэрцы, у думках. Можна разлюбіць нявесту, жонку, але разлюбіць радзіму — жахліва, немагчыма...*

*Была вясна. Я хадзіў па роднай беларускай зямлі. Я быў шчаслівы...*

Гэта радкі з ліста Бірулі да першага сакратара ЦК КП Беларусі Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнкі. Мастак напісаў іх у 1954 годзе, успамінаючы сваю першую пасляваенную паездку ў Беларусь у красавіку—маі 1947 года.

Вясна — любімая пара года Бірулі. За сваё доўгае жыццё ён пражыў шмат вёсен, і кожная, якая б цяжкая яна ні была, прыходзіла святам, кожную памятаў па днях і падзеях, кожная была непаўторнай, са сваімі фарбамі, галасамі.

*Нідзе на поўдні няма такой шматфарбнай, урачыстай вясны, як у нашых краях. На поўдні яна кароткая, хуткая. Наша прыходзіць надоўга. Яе вітаюць усе птушкі. Гнёзды яны робяць толькі ў нас...*

...У яго жыцці гэта была вясна светлага настрою і прадчування цікавай работы. Да яе рыхтаваўся загадзя. Пасля работы над шэдэўрамі драўлянага дойлідства Поўначы, якім аддаў восень сорак чацвёртага і зіму сорак пятага года, шмат працаваў у ленінскіх Горках і Ульянаўску, працягваючы ствараць пейзажную ленініяну. Але на пачатку вясны сорак сёмага дапісаў карціны, якія стаялі на мальбертах і ў Чарнышоўскім завулку ў Маскве, дзе была майстэрня, і ў «Чайцы». Адчуваў, што паездка ў Беларусь — вясна, якой яшчэ не было і якую павінен вітаць без цяжару ўчарашніх недаробак.

Мінск сустрэў цёпла. Яшчэ горад стаяў у руінах, але ўжо выраслі новыя прыгожыя дамы, на Савецкай вуліцы званіў трамвай. Ведаў загадзя, прыехаўшы — убачыў, як цяжка землякам, колькі трэба працы, каб узняць з папялішчаў вёскі і гарады, але тым мацней усхвалявала цеплыня, з якой сустрэла радзіма. Едучы сюды, усю дарогу думаў, ці той час выбраў, ці да яго тут людзям? А яны, гаспадары спапялёнай зямлі, зразумелі нават настрой, яго клопат — вывезлі за горад на Курасоўшчыну і пасялілі ў парку са старымі ліпавымі алеямі і яблыневымі садамі на беразе вялізнага рова, па дне якога бегла прыгожая ў маладой зеляніне рачулка, у белым невялікім, прыгожым і зграбным, з мансардамі і балконамі дамочку, які некалі належаў генералу Курасаву, цудам ацалеў у вайну і цяпер называўся Белай дачай. Пад акном стаяла легкавая аўтамашына, прасторная, вельмі зручная для паездак на натуру. Яе, сваю службовую, Панцеляймон Кандратавіч даў гасцям, Вітольду Каятанавічу і Алене Аляксееўне, на час жыцця ў Белай дачы.

Кожную раніцу, прачнуўшыся, Біруля выходзіў у яблыневы сад. Нізкія сонечныя прамяні, яшчэ не абласкаўшы зямлю, знаходзілі беласнежную кіпень яблынь і запальвалі яе ружовым святлом. Спявалі салоўкі, дразды. Слухаў вясновы грай на роднай зямлі і пачынаў трывожыцца. Нідзе, здавалася, не бачыў гэтакіх ружовых, у квецені, садоў. Усё роўна як на яблынях ляжала не толькі цяплынь сонца, але і гарачыня ваенных пажараў. Яшчэ і зязюля трывожыла. Забыўшы на снеданне, выносіў у сад эцюднік і пачынаў пісаць яблыневую квецень.

*Была думка: калі мне ўдасца адлюстраваць на палатне адраджэнне роднай зямлі, паказаць выключную працавітасць майго народа, я буду шчаслівы.*

Тут — і мэта, і праграма. Шчасце вызначана жаданнем народа адрадзіць зямлю, бацькаўшчыну. Вітольд Каятанавіч кожную раніцу спяшаецца да палатна.

Сама Белая дача і сад у квецені бачацца мастаку найчысцейшым астраўком знявечанай ворагам роднай зямлі, вобразам і сімвалам вернутага жыцця. Ён з захапленнем піша эцюды Белай дачы і саду ў майскай квецені. Настрой расквітнелай зямлі завалодвае душою. Але жыве і памяць. Яна пячэ. Сад Белай дачы — не той, што ў «Чайцы», які пісаў на беразе Удомлі, хоць і той лавіў на пэндзаль у майскай квецені. Гэты цвіце цяжка, яшчэ ўвесь у бліскавіцах вайны. Майская зеляніна пад дрэвамі адлівае чырванню бяды, шэранню папялішчаў, далягляд і акрайчык неба трывожна пунсавеюць, майская прозелень і просінь не змылі апёкаў. Яблынькі цвітуць нясмела, бель квецені, як сівы туманок, як першае вяселле ў спаленай вёсцы, і гэты чысты туманок маладога жыцця падымаецца да неба яшчэ на пакрыўленых злыбядой танклявых ствалах, на пакурчаных у нядаўняй бядзе галінах. Не, гэта — не проста яшчэ адзін май, не звычайная квецень яблынь. Гэта тое, што ў самой назве эцюда: «Беларусь. Яблыні ў квецені. 1947». Усё павінна быць ясна: на якой зямлі цвітуць яблыні, калі, якой вясною...

...Прыродная любоў да жыцця, якая вызначыла ў ім усё дарэшты — і працу, і сяброў, і настаўнікаў, і захапленні, і нават слабінкі характару, — роўная любові да вясны, а ў вясне ён бачыў перш за ўсё рунь, што не толькі апранала зямлю ў маладыя вопраткі, але давала ёй рух да мары, спадзяванняў, дастатку, заможнасці, шчасця. А гэта так трэба зямлі і людзям, якія выйшлі з вайны. І вось ён, мастак, ужо не можа доўга сядзець і пісаць на Белай дачы, ён выязджае на дарогі, якія вядуць ад дачы ва ўсе бакі Беларусі. А найперш — па ваколіцах Мінска. І піша — піша эцюды. Яго захапляе ўсё, што бачыць. Напісанае так і называе: «Мінскія ваколіцы», «Мінскія ваколіцы. Калгас «Сенніца», «Мінскія ваколіцы. Сенніцкая царква», «Мінскія ваколіцы. Беларуская вёска», «Мінскія ваколіцы. Вёска. Эцюд да карціны», «Мінскія ваколіцы. Белая дача»...

...Зрэшты, гэта заўсёды было пытаннем з пытанняў жывапісу — што такое эцюд і што такое карціна? Пытанне практыкі і тэорыі жывапісу. Тут, у Беларусі, Вітольд Каятанавіч сваімі эцюдамі і карцінамі нібы зноў, як у маладыя гады, працягвае спрэчку, для яго вельмі прынцыповую. Стаўленне да карціны і эцюда, якое ён дэманструе сваімі работамі, не пакідае раўнадушнымі маладых беларускіх мастакоў, для якіх Бялыніцкі-Біруля сам па сабе — школа жывапісу, прытым свая, нацыянальная...

...Такая патрабавальнасць да карціны была ў Вітольда Каятанавіча. І недарэмна ён зноў загаварыў пра гэта пасля паездкі ў Беларусь. Загаварыў — пасля. Але, працуючы на роднай зямлі, знявечанай вайною, пісаў пейзажы з a марaю аб карціне, якую адчуе, убачыць. Шукаў праз эцюды, якімі намацваў галоўнае, у якіх знаходзіў карціну пакрысе, па рысачцы, па фарбачцы.

Аднойчы выехаў за гоні калгаса «Сенніца», за гаёчкі-лясочкі, паехаў на поўдзень слуцкай дарогай. Вясновыя краявіды, якімі хацелася любавацца бясконца, змяняліся то спляжаным лесам, то здзічэлым полем, то папялішчамі. Зноў і зноў прасіў шафёра спыніцца, выходзіў з машыны, забрыдаў ад яе далёка — вялі то нечаканыя сляды вайны, то знакі ўваскрэслага жыцця, то галасы птушак, якія старанна рабілі гэтую вясну падобнай на ўсе ўдалыя вёсны. І раптам, адышоўшы далёка ад дарогі, здрыгануўся — перад ім, пад



«Зялёны май».

зазелянелым узгоркам, сунуўшыся жалезным тупым рылам у кручу, задраўшы свой усё яшчэ грозны хобат, стаяў мярцвяк — фашысцкі танк. За апошнія дні Біруля нямала пабачыў гэтакіх пачвараў, гармат ды танкаў, на палях, пад адхонамі дарог, па ўзлесках, але цяпер, толькі цяпер гэта ўбачылася іначай, па-новаму, значна. Быў іншы антураж? Так, вядома. Пад танкам дружна зеляне́ў мурог, вырасла ўжо маладая трава, і здавалася, што танк зарастае травою, урастае ў зямлю, што яна яго паглынае. Але і не гэта нават у першую чаргу кінулася ў вочы. Перад мёртвым жалезным «мамантам» на ўзгорку стаяла белая, у квецені, яблынька. Яны — танк і яблынька, жалезная махіна і танклявы жывы парастачак — стаялі адно перад адным, як на дуэлі, — вечныя ворагі. Працістаялі жыццё і смерць. І смерць была пад узгоркам, зарастала травою, а жыццё, як белым ветрам апранутае, урачыста ўзвышалася над смерцю, падпіраючы белым голлейкам чыстую просінь вясновага неба. Усё, рашуча ўсё тут, у пейзажы, падкрэслівала вечнае, як зямля, як свет, працістаянне жыцця і смерці: хатка за яблынькай, прасёлак у лагчыне, якім сюды прыпоўз чужынец і па якім цяпер у поле спяшаліся сеяць вясковыя людзі, сейбіт далёка ў полі, які ішоў за канём, за плугам.

Біруля расклаў эцюднік...

*...Карціну «Зноў расцвіла вясна (Па слядах разбітага ворага)» я ўбачыў у натуры, хоць напісана яна з выкарыстаннем эцюдаў.*

*Веданне роднай прыроды дапамагло мне стварыць пейзажны вобраз...*

Цікавае сведчанне. У ім — шлях да карціны, яе разуменне, значэнне натуры, работы над эцюдамі, унутранай падрыхтаванасці да спасціжэння вобраза.

Здаецца, Біруля даўно не ведаў такой унутранай засяроджанасці і паўнаты адчуванняў, як гэтай вясною. Абвастраецца, па-новаму выяўляецца прагнасць «праўды, прастаты і свабоды», якія ў ім некалі заўважыў Рэпін. Ідзе восьмы дзясятак гадоў, маладосць даўно пражыта. Яшчэ на пятым дзясятку ён з усёй сур'ёзнасцю называў сябе старым, але надзіва маладымі, па-маладому тэмпераментна пішуцца эцюды і карціны. Вочы і слых абвостраныя, думка працуе, пэндзаль у руцэ дакладны і лёгкі. Няўжо — другая маладосць, падобная на другое дыханне ў спартсмена?

Пазней у тым самым лісце да Панамарэнкі, згадваючы гэтую вясну, ён дасць ёй тлумачэнне:

*Вы наблізілі мяне да маёй радзімы. Дзён, праведзеных у роднай Беларусі, я не магу забыць да самай смерці...*

*...Я хадзіў па роднай зямлі, я быў шчаслівы. Але гады мяне скоўваюць. Іначай пабываў бы на Палессі, у Краснаполлі, каля мястэчка Чавусы на Магілёўшчыне...*

...З гэтакіх сустрэч, даўно жаданых, і сустрэча з Якубам Коласам.

Быў канец мая, вясна губляла свае блакітныя, салатава-срабрыстыя, ружова-жаўтлявыя тоны, паветра нагрэлася і загусцела, сонечнае святло страчвала далікатнасць, лагоду, цнатлівая чысціня святлаценяў набывала цяжар, глухату разрослай зеляніны, ліній. Вясна пераходзіла ў лета, ды яшчэ і адразу ў гарачае, бо сонца смаліла, дажджоў не было. Спадзяванні на тое, што маладая рунь дасць збавенне ад нястачы і голаду, неўзабаве прынясе на стол хлеб, рабіліся няпэўнымі. Патрэбны быў дождж. Колеры жыцця гаслі.

У адзін з гэтакіх дзён Біруля сабраўся ў госці да Якуба Коласа. Жаданне гэтае было з першых дзён прыезду ў Мінск, было і запрашэнне паэта. Нарэшце, адклаўшы работу, сеў у машыну, пасадзіў побач жонку, сяброў, якія жылі з ім на Белай дачы, і прыехаў да Коласа.

Канстанцін Міхайлавіч сустрэў гасцей каля дома. Вітаючыся, ён пазіраў на неба. Там збіраліся хмары, і Колас вельмі перажываў: ці будзе дождж? Гаворачы з Бірулем, зноў і зноў устаўляў у размову: «І ўсё будзе добра». Часам прыказка была як быццам дарэчы, але не заўсёды, і Вітольд Каятанавіч замаўкаў, гадаючы: да чаго б гэта?

Селі за стол на тэрасе. Размова пайшла весялейшая.

Неба ўжо зацягнулі хмары, пачаў накрапваць дожджык. Якуб Колас усхапіўся з-за стала, выйшаў у сад і, задраўшы галаў, падстаўляючы твар небу, лавіў ім нябесныя кроплі.

Дождж пайшоў дружнейшы, залапатаў у кронах. Колас вярнуўся за стол павесялелы, гаваркі, і ўжо ўвесь вечар, прыслухоўваючыся да дажджу, углядаючыся ў неба, паўтараў, пра што б ні ішла гаворка: «Будзе дождж — будзе і хлеб, і ўсё будзе добра».

Нібыта ягоны паўтор быў заклёнам: дождж мацнеў, пайшоў залівы. А Колас усё паўтараў: «Будзе дождж — будзе і хлеб, і ўсё будзе добра».

Гэта была незабыўная паездка да незабыўнага чалавека...

Калі Біруля ад'язджаў з Мінска, ён, развітваючыся з сябрамі-беларусамі, казаў ледзь не кожнаму Коласавымі словамі: «Будзе дождж — будзе і хлеб, і ўсё будзе добра». Словы паэта ўрэзаліся ў памяць, бо ўрэзаліся ў душу. Адчуўшы ў іх глыбіню народнай мудрасці і любові паэта да сваёй зямлі, Біруля прыняў іх як свае, яму падораныя, і ўжо сам, кажучы іх, зычыў роднай зямлі і хлеба, і дожджыку адраджэння.

# Куды вядзе бальшак?

СУСТРЭЧА з бацькаўшчынай была настолькі хвалюючай і творча плённай, што калі роўна праз год, у наступным маі, мастакі Беларусі сабраліся на свой першы пасляваенны з'езд, Біруля з радасцю прыязджае ў Мінск. Ён ужо не бярэ з сабою ні сабаку, ні стрэльбу, ні фарбы, пэндзлі, эцюднік, хоча проста пабачыцца з жывапісцамі роднай зямлі, усіх абняць, усім прызнацца ў тым, што хвалюе, — апошні год быў доўгім роздумам аб Беларусі.

І вось — з'езд. Што сказаць мастакам роднага краю? Работы многіх з іх бачыў — у майстэрнях, на выстаўках. Сачыў за беларускай прэсай. Стараўся чытаць усё, што пісалі мастакі, што пісалі пра мастакоў. Хацелася ведаць, на якой глебе набірае сілы тутэйшае выяўленчае мастацтва, яго адносіны да свайго мінулага, да традыцый, яго маладыя павевы. У зале сядзела моладзь. Якая яна? Што шукае? У што верыць?..

...Пашану да папярэднікаў, выдатных настаўнікаў, ён сам пранёс праз усё жыццё ў сэрцы і не ўяўляў, як можна працаваць, рабіць нешта вартае, ігнаруючы традыцыі. Убачыўшы ў зале маладых мастакоў, на момант успомніўшы сябе маладым, падумаў: ці ведаюць цяперашнія маладыя, нашчадкамі якіх традыцый з'яўляюцца? Ці вучацца на нацыянальных традыцыях? Прэса, якую чытаў, само гэта пытанне закрэслівала. Быццам спадчыны ў беларусаў не было і няма. Мог ён, Біруля, стары мастак, пра гэта маўчаць?

*— Некаторыя мастацтвазнаўцы сцвярджаюць, што да канца дзевятнаццатага стагоддзя Беларусь на карце мастацтва была белай плямай, што заснавальнік беларускага выяўленчага мастацтва — Ю. Пэн. Гэта няпраўда. Гэта фальсіфікацыя нашай гісторыі. Пэн з'явіўся ў Беларусі, калі беларускае мастацтва мела ўжо сваю вялікую гісторыю. Пэн не меў уяўлення аб яго нацыянальных традыцыях. Звязваць крыніцы з імем Пэна — значыць усё ставіць з ног на галаву, ігнараваць гістарычнае мінулае, яго цудоўныя рэалістычныя традыцыі. Мастацкая крытыка прыніжае лепшых мастакоў-рэалістаў, якімі мы павінны ганарыцца...*

Рэзка? Але — ці празмерна? І наогул, ці ўласцівы гэтакі тон выступлення Вітольду Каятанавічу?..

*— Ці шмат хто з маладых сённяшніх мастакоў ведае Мікодыма Юр'евіча Селівановіча? Сын прыгоннага селяніна з Вілейшчыны, ён дасягнуў высокага ўзроўню жывапіснай культуры ў выдатных мазаічных і жывапісных творах, такіх, як «Вязень», «Раніца мудрэйшая за вечар», «Партрэт бацькі мастака», «Галава дзяўчынкі» і многіх іншых. Ён упрыгожваў Ісакіеўскі сабор у Пецярбургу, а створаная ім галава Матфея — адзін з шэдэўраў сусветнага мазаічнага мастацтва...*

*Ці ўспомнім Сяргея Канстанцінавіча Заранку з Магілёўшчыны. Як і Селівановіч, ён нарадзіўся ў сям'і прыгоннага селяніна, а вырас да акадэміка жывапісу. Вучань Венецыянава стаў настаўнікам Пярова, Пранішнікава, Макоўскага, Саўрасава, Пукірава і іншых карыфеяў жывапісу. Заранка — гэта сапраўднае ўпрыгожанне беларускага нацыянальнага мастацтва, наш вялікі нацыянальны гонар. Яго рэалістычныя традыцыі маюць выключнае значэнне і непагасны сэнс для кожнага з нас. Трэба зрабіць усё, каб імя Заранкі гучала як імя найвыдатнейшага сына свайго народа. Беларусы павінны ім ганарыцца, а не замоўчваць, як гэта робіцца сёння...*

Пра Заранку мог расказаць і такое, што стала сваім лёсам. Яшчэ калі першы год вучыўся ў Маскве, разам з Жукоўскім хадзіў па ўсіх музеях і выстаўках, шукаючы работы Заранкі, з дзіўным адчуваннем, што гэта — роднае, сваё. Побач у вучылішчы былі Макоўскі, Пранішнікаў — вучні Заранкі, і калі яны расказвалі пра настаўніка, кожнае іх слова лавіў як святое. А калі жыў у доме Калакольцава на Кезадры, колькі разоў прыносіў кветкі на магілу Венецыянава, думаючы і пра Заранку. Выстройвалася дзіўная дарога ў мастацтве, на якой апынуўся і ён, Біруля: Венецыянаў вучыў Заранку, Заранка вучыў Саўрасава, Саўрасаў вучыў Левітана, Левітан вучыў яго, Бірулю. Які бальшак! І ён, Біруля, на гэтым бальшаку. Хіба нельга разгубіцца? Здавалася, што бальшак ад самога Бога. Няўжо і ён, Біруля, боскі абраннік? Так, ён губляўся ад такога суседства на сваім бальшаку. Але падтрымлівала думка: Заранка — не з неба, з Магілёўшчыны, амаль з суседняй вёскі, свой мужык, зямеля, а без яго хіба не рассыпаўся б увесь бальшак? Здавалася, што ён жывы і побач.

*А нядаўна ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў артыкуле Есакова з дзіўным невуцтвам чарнілася імя яшчэ аднаго славутага беларускага жывапісца Апалінара Гілярыевіча Гараўскага, які названы вучнем Дзюсельдорфскай школы і прапаведнікам мастацтва для мастацтва. Артыкул паказвае, што Есакоў нічога не ведае ні пра Дзюсельдорфскую школу, ні пра Гараўскага, ні пра прапаведнікаў мастацтва для мастацтва і што ён, крытыкуючы, не бачыў ніводнай работы мастака. Хто такі Гараўскі? Ён быў адным з найвыдатнейшых перадзвіжнікаў і выстаўляў свае карціны разам з вялікім Рэпіным...*

...Біруля спыняецца на трох імёнах, але падкрэслівае, што гэтыя тры — з вялікай плеяды беларускіх жывапісцаў, не толькі не ацэненых на радзіме, якіх даўно ацанілі ў вялікім свеце, але знарок замоўчаных ці зняважліва забытых і нават апляваных.

Што робіцца?

Пра гэта ён доўга думаў. Адным адмаўлялі ў мастацтве заходнія матывы ды ўплывы, другім — усходнія, адны намагаліся спісаць мастацтва ўсходняга краю, другія — заходняга. І ўрэшце? Кроілі па жывым целе, збядняліі нішчылі душу народа, самі сябе абувалі ў лапці і апраналі ў зрэб'е. Якія маглі быць схемы? Асабліва ў гісторыі беларусаў. Што ні чалавек — то і лёс. Мастаку-жывапісцу патрэбна школа, акадэмія, калі ён не жадае абмежаваць сябе лубком, вясковым прымітывам, калі хоча заявіць пра сябе і свой народ у цывілізаваным свеце. Што было б з Заранкам ці Гараўскім, калі б яны засталіся ў вёсках, у якіх нарадзіліся, ці ў Бабруйску, у Магілёве, у Мінску, нарэшце, дзе не было сапраўдных прафесійных школ? Ці з ім, Бірулем, калі б ён не знайшоў бальшак на Мясніцкай у Маскве, школу перадзвіжнікаў, Паленава і Левітана, Рэпіна і Куінджы, Касаткіна і Сцяпанава? Пытанне было ў гэтым. Тут пралягаў падзел на «нашых» і «не нашых», хоць адкрыта пра гэта сказаць ніхто не асмельваўся. Вялікая палітыка? Ці балотная валтузня? Калі гаварыць пра нацыянальную ідэю, дык ці не трэба ставіць пытанне іначай: тыя ж Заранка і Гараўскі, Жукоўскі і Біруля ці засталіся беларускімі мастакамі, прайшоўшы школы Масквы, Пецярбурга, Заходняй Еўропы?

Усё гэта былі нечаканыя ўражанні. Але яны не адштурхоўвалі ад Беларусі. Наадварот, мацней, як летась, пасля той прыемнай паездкі, Біруля адчуў, што без роднай зямлі, далёка ад яе, жыць становіцца ўсё цяжэй, што яна, родная, вабіць да сябе не толькі чысцінёй і святлом, але і сваімі бедамі, што без яе ні жыць, ні пісаць не зможа.

І ён зноў збіраецца ў Беларусь, на ўсё лета — жыць, працаваць.

Але ў той час Біруля не ведаў, што чакала яго тым летам...

## ІНШАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

**З нагоды 140-годдзя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Звязда» пацікавілася ў людзей розных творчых прафесій, што яны думаюць пра мастацтва выдатнага беларускага творцы.**

**Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, мастак, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі:**

— Гэты мастак унікальны сваім талентам. Ён як ніхто адчуваў колер, паўтоны, паветра. Ён пранёс праз усё жыццё беларускі сярэбраны каларыт, адчуванне прыроды сваёй роднай Магілёўшчыны, Бялынічаў. Хоць ён шмат працаваў у Расіі, але асаблівае адчуванне беларускай прыроды ў яго засталося з маленства. Сёння творчасць Бялыніцкага-Бірулі мы ўспрымаем усім па-іншаму. У Беларусі самая вялікая калекцыя яго твораў (каля 400, уключаючы эцюды). Я асабіста лічу гэтага мастака нашым нацыянальным геніем. Зараз у серыі «Нашы славутыя мастакі» рыхтуецца кніга пра Вітольда Каятанавіча. Гэта мой любімы мастак, ён мне блізкі па духу. Такі імпрэсіяніст, не падобны ні да кога. Яго не параўнаеш ні з французскімі імпрэсіяністамі, ні з рускімі. Ён сярэбраная веха. Я нават карціну яму прысвяціў — «Раніца юнага мая». І трэба адзначыць, што сёлета насамрэч у нас трайны юбілей: 140 гадоў Бялыніцкаму-Бірулю, 100 гадоў яго дому «Чайка» і 30 гадоў дому-музею Бялыніцкага-Бірулі (гэта філіял нашага музея) у Магілёве.

**Павел ВАЙНІЦКІ, мастак, мастацтвазнавец:**

— У Бялыніцкага-Бірулі вельмі нехарактэрны для беларускага мастацтва каларыт. Гэта выдатны мастак-мадэрніст у адным шэрагу з Фердынандам Рушчыцам. Гэта якраз тыя мастакі, якія зрабілі беларускае мастацтва такім, якім яно павінна было быць. Усе гэтыя перамалёўкі і капіяванне прадметнай рэальнасці насамрэч даволі прыкрыя. Я маю на ўвазе той сацрэалізм, які нас накрывае дасюль. А гэтыя людзі паказалі, што можна неяк інакш канстатаваць рэальнасць, рабіць творчыя нюансаваныя рэчы. І пры гэтым не адмаўляцца ад прадметнага свету. Гэта цудоўная творчая інтэрпрэтацыя рэальнасці.

**Уладзімір КАНДРУСЕВІЧ, кампазітар:**

— Мне здаецца, што гэта адзін з першых беларускіх мастакоў, які выйшаў на вельмі высокі ўзровень. І пасля яго карцін, прысвечаных беларускай прыродзе, пра Беларусь даведаліся далёка за яе межамі. Прынамсі, на прасторы, якая зараз называецца постсавецкай. Рэалізм Бялыніцкага-Бірулі адлюстроўвае сутнасць прыроды. Гэта квінтэсенцыя беларускай прыроды.

**Валерыя КУСТАВА, паэт:**

— Яшчэ з маленства памятаю карціны Бялыніцкага-Бірулі. Памятаю ягоныя беларускія хаткі ў снезе — такія родныя і казачныя, як сны. Мяне адразу зачаравалі яго зімовыя і веснавыя пейзажы. Нават перадусім зімовыя. Столькі пяшчоты, дыхання і празрыстасці ў іх было. Даспадобы прыйшліся і колерныя спалучэнні на яго палотнах — срэбрана-бэзавы і мяккі зялёны. Гледзячы на зіму Бялыніцкага-Бірулі робіцца не сцюдзёна, а ўтульна. У дзяцінстве мяне ўразіла і спадабалася яго імя — Вітольд і мастацкае прозвішча — Бялыніцкі-Біруля. Менавіта дзякуючы гэтаму мастаку я даведалася, што на Беларусі ёсць такое мястэчка — Бялынічы. Цешыць, што хоць большую частку жыцця мастак і пражыў у Расіі, але ён ніколі не парываў повязь са сваёй радзімай. Гэта выявілася і на яго карцінах, і ў дадатковым складніку прозвішча: Бялыніцкі. Ён рэгулярна наведваў Беларусь, дзе і была напісана частка яго геніяльных пейзажаў. Некалькі гадоў таму мне пашанцавала трапіць і ў музей В. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве, і прайсціся па вуліцы,названай у яго гонар.

**Леанід ШЧАМАЛЁЎ, народны мастак Беларусі:**

— Найбольш цікавая яго творчасць (у нацыянальным сэнсе) пасляваеннага перыяду. Ён зрабіў для Беларусі вельмі цікавыя працы. У іх адчуваецца нацыянальная культура, колер, гук. Усё, што ён рабіў у Расіі, цікавае, ён там вучыўся. Але беларускі перыяд мне здаецца найбольш адметным. Так я разумею яго. Безумоўна, гэта цудоўны мастак: і ў рускім «стане», і ў беларускім. Ён зрабіў шмат тыповых, настраёвых карцін пра нашу прыроду. З уласным веданнем прыроды і чалавека ў ёй. У яго вельмі пяшчотная ўнікальная палітра ў жывапісе. Гэты мастак заслугоўвае самай вялікай увагі.

**Рыгор СІТНІЦА, літаратар, мастак, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў:**

— Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля — адна з велізарных постацяў у беларускай нацыянальнай культуры. Ягоны акадэмічны па сваёй сутнасці жывапіс вельмі эмацыйны, працяты нацыянальным настроем. З яго бяруць пачатак творчыя памкненні многіх беларускіх мастакоў. Нават тыя, якія наўпрост не вучыліся ў яго, усё адно лічаць сябе яго вучнямі. Мы можам толькі ганарыцца, што ў нашага народа ёсць такі выдатны творца. Дзякуй Богу, у нашых музеях шмат твораў гэтага мастака. Але мы яшчэ недастаткова паднялі гэтае імя на належны ўзровень. Мы павінны ўсе разам рабіць усё, каб імя Бялыніцкага-Бірулі гучала на самым высокім узроўні.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## Отчет Местного благотворительного фонда «Помощь — это просто!» (далее — Фонд) об использовании своего имущества в 2011 году.

*Утвержден Протоколом правления фонда № 5 от 23.02.2012 г.*
*Утвержден Протоколом заседания Попечительского совета Фонда № 1 от 23.02.2012 г.*

УНП 690314835

| н/п | Сведения, обязательные для включения в состав отчета | Информация Фонда |
|---|---|---|
| 1. | Информация о количестве учредителей Фонда | Один учредитель — совместное общество с ограниченной ответственностью «Баниар». |
| 2. | Информация о стоимости имущества Фонда | А) стоимость имущества, переданного учредителем Фонда — 7802060 рублей; Б) поступления от проводимых в 2011 году мероприятий — 3472332 рубля. В) пожертвования юридических и физических лиц — 1677930 рублей; Г) иные доходы у Фонда в 2011 г. отсутствовали. |
| 3. | Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе. | 3731482 рубля. |
| 4. | Информация об унитарных предприятиях, хозяйственных обществах, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии Фонда в таких юридических лицах. | В 2011 г. Фонд не создавал унитарных предприятий или хозяйственных обществ, не становился участником в таких юридических лицах. |

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения юридического лица, контактный телефон покупателя акций | **ОАО «Стройдетали», 222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 134 контактный телефон: 8 01771 3 25 48** |
| Полное наименование и местонахождение брокера, который будет заключать договора купли-продажи | **ЗАО «Агрокапитал», г. Минск, ул. Революционная, д. 6В** |
| Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | **ОАО «Стройдетали», 222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 134** |
| Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении | **Последующее аннулирование и уменьшение уставного фонда** |
| Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель | **15 000 (Пятнадцать тысяч) простых (обыкновенных) акций** |
| Цена, по которой эмитент намерен приобретать акции собственного выпуска | **Фиксированная цена, установленная общим собрание акционеров — 127 000 (Сто двадцать семь тысяч) рублей** |
| Срок, форма и порядок оплаты акций | **В течение 15-ти дней с момента заключения договора купли-продажи акций, безналичный расчет** |
| Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций | **ОАО «Стройдетали», 222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 134** |
| Дата начала срока представления предложений акционеров о продаже акций | **1 марта 2012 года** |
| Дата окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций | **15 марта 2012 года** |
| Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций) | **16 марта 2012 года** |
| Дата окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций) | **16 апреля 2012 года** |

УНП 600246748

## Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»

**23 марта 2012 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Рапс», расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.**

**Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2011 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2011 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 год и 1-й квартал 2013 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об увеличении размера уставного фонда путем увеличения номинальной стоимости акций.
9. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Рапс».
10. Об одобрении заключения договоров о переводе долга на жилые дома и договоров купли-продажи жилых домов, построенных (реконструированных, приобретенных с привлечением льготных кредитов, полученных в открытом акционерном обществе «Белагропромбанк»).
11. О продаже жилых домов (квартир), построенных (реконструированных, приобретенных с привлечением льготных кредитов, полученных в открытом акционерном обществе «Белагропромбанк»).

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу:
**Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 14 по 22 марта 2012 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 22 марта 2012 г. по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — **23 марта 2012 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 27 февраля 2012 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

**Справки по тел. 8 017 506 92 11, 8 017 506 93 41.**

УНП 600068480

**12 марта 2012 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гранд Фэшен Хаус».**

Повестка дня:
1. О совершении сделок общества.
Местонахождение общества: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.
Начало регистрации участников собрания — 13.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 05.03.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Совет директоров.

УНП 290671335

Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНН № 0007330 считать недействительным.

УНП 101883943

## ОДО «КСМ Старое Село» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего ОДО «КСМ Старое Село»

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 5%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Формовочный цех, общей площадью 281 кв.м, год постройки 1956 г. – 37 669 800 рублей; Автомат для нарезки кирпича – 25 305 600 рублей; Вальцы СМ 369 – 10 224 600 рублей; Глиномешалка СМ 447 – 25 095 000 рублей; Пресс СМК 435 – 32 205 600 рублей; Подаватель СМ 1091 – 2 150 400 рублей; Рольганг приводной – 3 891 000 рублей; Транспортер, длина 14 м – 23 922 000 рублей; Транспортер, длина 12 м – 20 363 400 рублей; Транспортер, длина 16 м – 24 819 000 рублей; Транспортер, длина 16 м – 24 819 000 рублей; Электронасос ЭЦВ 6 10-80 – 538 800 рублей; Полуавтомат – 4 131 600 рублей | 235 135 800 | 11 756 790 |
| 2 | Контора, общей площадью 201,5 кв.м, год постройки1986 г. | 26 293 800 | 1 314 690 |
| 3 | Подстанция КТП-29, общей площадью 12,0 кв.м | 8 164 200 | 408 210 |
| 4 | Печь кольцевая, общей площадью 762,2 кв.м, с сушильными сараями (12 шт.), год постройки 1971 г. – 662 058 600 рублей; Люлечный конвеер 6 катушек – 35 753 400 рублей; Дымосос ВНД-9 – 2 436 600 | 700 248 600 | 35 012 430 |
| 5 | Артскважина с глубинным насосом | 2 349 600 | 117 480 |
| 6 | Принтер лазерный HP laserjet 1010 | 140 400 | 7 020 |
| 7 | Погрузчик Р-1,0, год выпуска 1986 г. | 3 280 200 | 164 010 |
| 8 | Автомобиль КРАЗ 256Б1, год выпуска 1990 г. | 10 634 400 | 531 720 |

**Организатор торгов:** управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел./факс. 8232 683744, 8232 682550, моб. (8029) 621 22 36.

**Продавец:** ОДО «КСМ Старое Село», Гомельская обл., Ветковский р-н, д. Старое Село.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 8.00 до 17.00.

**Задаток перечисляется** до 19.03.2012 г. (включительно), на р/с 3012330651004 в Управление по Гомельской области ОАО «Франсабанк» г. Гомель, код 153001266, УНП 490318136.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

**Срок подачи заявления:** с момента выхода настоящего объявления до 16.00. 19.03.2012 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5

**Дата, время, место проведения открытого аукциона:** 20.03.2012 года в 12.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

